№ 5 (603) 4 лютага 2009

www.nn.by

незалежная газета

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе 1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады

**Што ад БАТЭ засталося**

Старонка 4



**Ірына Абельская жывая!**

Старонка 3



**Начныя матыліцы**

Старонка 9

## У НУМАРЫ

**Адстаем, але нагонім?**

З пачатку фінансавага крызісу афіцыйны курс даляра ў Беларусі вырас на 30,4%, у Расіі — на 53,1%, ва Украіне — на 59,1%. **Старонка 2.**

**Крызіс не цётка**

Макей узначаліў, Рух за Свабоду запрошаны. Пры Адміністрацыі прэзідэнта ствараецца Грамадска-кансультацыйная рада, у якую маюць увайсці і некалькі фігураў з апазіцыі. **Старонка 6.**

**Дзень Волі-2009**

Ад Акадэміі навук да Кастрычніцкай. **Старонка 6.**

**Доктар, уратуй сябе**

Пра што можна казаць, калі рэакцыі АДС на такую падзею, як дэвальвацыя беларускага рубля, прыйшлося чакаць больш за два тыдні? Віталь Сіліцкі палемізуе з Лявонам Баршчэўскім і Анатолем Сідарэвічам. **Старонка 7.**

**Як стаць тэлезоркай**

Расказвае Наталля Дзейка, фіналістка шоу на АНТ «Пасаг для нявесты». **Старонка 11.**

**Ці хадзіў па Беларусі «Чорны кот»?**

Легенда пра падполле Вітушкі — аперацыйная гульня савецкіх спецслужбаў. Такога меркавання трымаецца польскі гісторык Рафал Унук. **Старонка 12.**

«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — старонка 2.

# Лукашэнка прадаў беларускае неба

**Пагадненне аб стварэнні адзінай рэгіянальнай сістэмы супрацьпаветранай абароны (СПА) паміж Беларуссю і Расіяй падпісалі 3 лютага ў Маскве Дзмітрый Мядзведзеў і Аляксандр Лукашэнка.**



PHOTO.BYMEDIA.NET

Разам з тым памочнік Мядзведзева Сяргей Прыходзька паведаміў, што Расія гатовая даць Беларусі некалькі дзесяткаў мільярдаў рублёў крэдыту дадаткова. Гэта тыя грошы, якія Лукашэнка прасіў для пераходу ва ўзаемным гандлі на адзіную валюту. Хаця яшчэ тыдзень таму міністр фінансаў РФ Дзмітрый Панкін гаварыў, што пытанне выдачы крэдыту нават не разглядаецца.

Скручаная глыбокім эканамічным крызісам Расія таксама не губляе надзеі перавесці Беларусь на расійскі рубель, які абясцэніўся за паўгоду на 60%. Найперш Масква носіцца з планам надаць свайму рублю статус рэзервовай валюты. І Мінск выкарыстоўвае гэты чарговы імперскі пункцік, каб выбіваць крэдыты.

Той жа Сяргей Прыходзька па сканчэнні сустрэчы двух кіраўнікоў паведаміў, што Беларусь і Расія распрацавалі сумесны план дзеянняў па пераходзе да адзінай валюты — расійскага рубля. План разлічаны на адзін год, паведаміў памочнік прэзідэнта.

Адначасова ён заўважыў, што «не варта забягаць наперад і ставіць тэрміны ўвядзення адзінай валюты». «У плане сумесных дзеянняў па гэтым пытанні прапісаныя канкрэтныя інструменты. Гэта тэхналагічная схема... Беларусь адназначна выказалася за пашырэнне інтэграцыйных працэсаў», — растлумачыў С.Прыходзька.

Але галоўная прычына, чаму Крэмль ізноў расшчодрыўся, — гэта падпісанне пагаднення аб стварэнні адзінай сістэмы супрацьпаветранай абароны. Фактычна, гэта ў завуаляванай форме перавод беларускай супрацьпаветранай абароны ў падпарадкаванне Масквы.

«Знакавай падзеяй з'яўляецца ўмацаванне вайскова-палітычнага складніка нашага супрацоўніцтва. Мы да гэтага дастаткова доўга ішлі. Работа скончаная... Яго рэалізацыя павысіць абараназдольнасць Расіі і Беларусі», — сказаў Дзмітрый Мядзведзеў.

У баявы склад адзінай сістэмы ПВА прапануецца ўключыць 5 авіячастак, 10 зенітна-ракетных частак, 5 радыётэхнічных частак і адну вайсковую частку радыёэлектроннай барацьбы. Камандуючага будуць прызначаць на пасаду кіраўнікі абедзвюх краін.

Расія вядзе ўсё больш і больш агрэсіўную палітыку на постсавецкіх тэрыторыях. Такім чынам, у выпадку новага ўзброенага канфлікту Расіі з адной з суседніх дзяржаваў у вайну можа быць уцягнутая і Беларусь. Як заявіў галоўны камандуючы Ваенна-паветраных сілаў РФ генерал-палкоўнік Аляксандр Зелін, Беларусь стане першым эшалонам у ахове паветраных межаў саюзнай дзяржавы. І байцу 29-й зенітна-ракетнай брыгады Івану Шылу (глядзі старонку 4), магчыма, давядзецца збіваць самалёты «ворагаў Расіі».

**Зміцер Панкавец**

# Асуджаныя сябры асацыяцыі «Чэсць»

**якой раней кiравалi Сiвакоў i Паўлiчэнка. Маскоўскi суд Мiнску вынес прысуд у гучнай крымiнальнай справе супраць супрацоўнiкаў сiлавых структураў. На лаву падсудных трапiлi 6 чалавек. На незаконных фiнансавых аперацыях яны зарабiлi больш за 150 мiльёнаў даляраў.**

Як выявiла следства, кiраўнiком злачыннай групы быў Андрэй Шырэй. Ён i 6 яго змоўшчыкаў арганiзавалi больш за 20 падстаўных фiрмаў. Праз гэтыя кампанii ажыццяўляўся абмен безнаяўных беларускiх рублёў на наяўныя даляры. Клiенты ў Шырэя былi самыя розныя — ад дробных прадпрымальнiкаў да буйных дзяржаўных кампанiяў.

«Гэта чалавек, якi раней неаднаразова быў асуджаны, асуджаны ён у тым лiку i за лжэпрадпрымальнiцкую дзейнасць. Судзiмасць не пагашаная, гэта значыць, чалавек рэгулярна займаўся злачыннай дзейнасцю. Так, сапраўды, ён займаў пасаду камерцыйнага дырэктара асацыяцыi «Чэсць», — паведамiў Сяргей Кунаш, дзяржаўны абвiнаваўца, тэлеканалу АНТ.

«Чэсць» яднае былых байцоў спецназу.

Пры затрыманнi ўдзельнiкаў злачыннай групы ў iх канфiскавалi толькi гатоўкай больш за 270 тысячаў даляраў, дзесяткi кампутараў i ноўтбукаў, на разлiковых рахунках падстаўных фiрмаў арыштавана каля 700 тысячаў даляраў. Сама крымiнальная справа змясцiлася ў 250 тамоў. За незаконную прадпрымальнiцкую дзейнасць удзельнiкi злачыннай групы атрымалi розныя тэрмiны ад 2 да 5 гадоў, акрамя таго ў iх будзе канфiскаваная ўся маёмасць. Сам Шырэй адправiцца ў калонiю на 6 гадоў. Але самае галоўнае, што ўсе ўдзельнiкi злачыннай групы абавязаныя выплацiць дзяржаве больш за 150 мiльёнаў даляраў.

Варта адзначыць, што раней асацыяцыяй «Чэсць» кiравалi экс-мiнiстр унутраных справаў Юры Сiвакоў i былы камандзiр САХРу Дзмiтры Паўлiчэнка.

**Belaruspartisan.org**




### «Капiтан Танака» запрашае малых

**7 лютага (у суботу) ў 16.00** запрашаем Вас i Вашых дзетак на прэзентацыю кнiгi Алеся Кудрыцкага «Капiтан Танака». **Месца сустрэчы: Мiнск, Старавiленскi тракт, 41, Палац дзяцей i моладзi, каб. 108.**

У праграме: знаёмства з аўтарам i выдаўцамi, майстар-клас па ляпленнi Танакаў з пластылiну, прагляд мультфiльму, аўтографы i фотаздымкi.

Не забудзьцеся прыхапiць пластылiн, дошчачкi, сурвэткi!

Даведкi: (029) 676-89-88 (Стася), e-mail: n.dzietki@yahoo.com

## СЦІСЛА

### Нацбанк схавае статыстыку па гандлi валютай

Нацбанк вырашыў часова не даваць аператыўнай статыстыкi па гандлi банкаў валютай з насельнiцтвам, каб у цяперашняй сiтуацыi лiшнi раз «не хваляваць людзей». Агульныя звесткi аб гандлi валютай з банкамi ў студзенi апублiкавала Беларуская валютна-фондавая бiржа. На бiржы попыт перавысiў прапанову ў 1,6 разу, цi амаль на 400 млн даляраў.

### Сiдаровiч пробашчам у Жодзiне

Айцец Андрэй Сiдаровiч стаў пробашчам касцёлу ў Жодзiне. Ранейшы жодзiнскi пробашч Вячаслаў Пялiнак зойме месца пробашча ў Барысаве.

**ЗП**

# Адстаём, але нагонiм?

З пачатку фiнансавага крызiсу афiцыйны курс даляра ў Беларусi вырас на 30,4%, у Расii — на 53,1%, ва Украiне — на 59,1%. З пачатку 2008 г. сiтуацыя на валютных рынках гэтых дзяржаваў развiвалася на падобны сцэнар.

Беларусь. За першыя сем месяцаў i першы тыдзень жнiўня 2008 году афiцыйны курс даляра знiзiўся на 1,8% — з 2150 да 2111 рублёў. Гэты курс (самы нiзкi пасля 3 кастрычнiка 2003 году) фiксаваўся з 8 жнiўня па 10 верасня i з 25 верасня па 1 кастрычнiка. Пасля гэтага даляр падаражэў на 4,2%, i на канец году яго курс склаў 2200 рублёў. 2 студзеня 2009 года афiцыйная кацiроўка амерыканскай валюты была павышана на 20,5% — да 2650 рублёў. Да канца студзеня курс павялiчыўся яшчэ на 3,8% — да 2752 рублёў (новы гiстарычны максiмум). Сумарны рост склаў 30,36%.

Расiя. З 1 студзеня па 16 лiпеня 2008 году афiцыйны курс даляра знiзiўся на 5,8% — з 24,5462 да 23,1255 рубля (самы нiзкi курс пасля 13 сакавiка 1999 году). Да 31 снежня даляр падаражэў на 27% — да 29,3804 рубля, а ў студзенi гэтага году — яшчэ на 20,5% — да 35,4146 рубля (новы гiстарычны максiмум). Сумарны рост курсу — 53,14%.

Украiна. З пачатку студзеня да другой паловы лiпеня 2008 году даляр патаннеў на 4,2% — з 5,05 да 4,84 грыўны. Такая кацiроўка фiксавалася 21—23 лiпеня (найменшая пасля 7 снежня 1999 году). Потым пачаўся рост афiцыйнага курсу, якi да 19 снежня дасягнуў 62,8% — 7,8788 грыўны за даляр, што стала новым гiстарычным максiмумам (наяўны — 10 грыўнаў). Да канца году афiцыйная кацiроўка знiзiлася на 2,3% — да 7,7 грыўны. На гэтым узроўнi яна пратрымалася ўвесь студзень гэтага году. Сумарны рост курсу даляра — 59,09%.

**Дзмiтрый Уласаў, БелаПАН**


# Не ўсё ў жыццi апошнi раз

## Падпiсацца можна праз Рэдакцыю i праз «Белпошту». Мы рэкамендуем — праз Рэдакцыю

Мы рэкамендуем i просiм чытачоў падпiсвацца праз Рэдакцыю. Наша сiстэма дастаўкi газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Усе тыя, каго такi спосаб атрымання газеты задавальняе, хай застаюцца вернымi такой падпiсцы.

1. Яна нам выгаднейшая фiнансава.

2. Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

3. Лiчым важным захаваць сiстэму самараспаўсюду дзейнай. Лiшне тлумачыць, чаму.

Цана падпiскi праз Рэдакцыю **10 000 руб. на месяц**.

Падпiсныя iндэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — **63125**, для прадпрыемстваў — **631252**. Падпiсацца можна на кожнай пошце. Цана гэтай падпiскi — 12 000 руб. на месяц.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

ПВУП "Суродзiчы", УНП 190 786 828

МГД ААТ "Белiнвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мiнск, код 764

Рахунак атрымальнiка: 3012 206 280 014

Асабовы рахунак:

(прозвiшча, iмя, iмя па бацьку, адрас)

| Вiд аплаты | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|
| За газету "Наша Нiва" | | | |

Агулам

Касiр

КВIТАНЦЫЯ

ПВУП "Суродзiчы", УНП 190 786 828

МГД ААТ "Белiнвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мiнск, код 764

Рахунак атрымальнiка: 3012 206 280 014

Асабовы рахунак:

(прозвiшча, iмя, iмя па бацьку, адрас)

| Вiд аплаты | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|
| За газету "Наша Нiва" | | | |

Агулам

Касiр М.П.

**Каб штотыдзень атрымлiваць газету,**

дасылайце адрасы i грошы за газету. Кошт на месяц — 10 тыс. рублёў.

1) Просiм усiх ахвотных чытаць газету **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы i тэлефоны. Гэта можна зрабiць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мiнск, а/с 537.

2) **Просiм у бланку банкаўскага паведамлення цi паштовага перакazу дакладна i разборлiва пазначаць адрас, у тым лiку паштовы iндэкс i код пад'езду.**

Тры гады «НН» можна было атрымаць толькi падпiсаўшыся праз Рэдакцыю. I мы завялi традыцыю дзякаваць усiм тым чытачам, якiя пералiчаюць грошы на выхад газеты.


### Дзякуй

**Пятру Д.** з Свiслацкага раёну.
**Т.Б., Андрэю С., Алене С., Барысу Ч.** з Магiлёва.
**Уладзiмiру Т., Аляксандру П.** з Жлобiнскага раёну.
**Мiкалаю Б., Вiктару З., Аляксандру К., А.Ш., Г.Г., Дзмiтрыю Р., А.П., Валерыю Б., Уладзiмiру М.** з Брэсту.
**Марыi Н., Г.К., Уладзiмiру К., Iвану В., С.К., Леанiле Г., А.А., Л.Ш., П.С.** з Мiнскага раёну.
**Вiктару Л.** з Докшыцкага раёну.
**Сяргею В., Аляксандру П., Руслану К., Мiкалаю К., Мiкалаю Ч., Сцяпану Н., Лявонцiю А.** з Полацкага раёну.

# Што ад БАТЭ засталося

**Аб'ектыўная, але горкая рэальнасць беларускага футболу — унікальную каманду раскупілі.**



Юлія Дарашкевіч

Мінулай восенню ўся краіна перажыла некалькі імгненняў нацыянальнага гонару, дзякуючы выступу ў групавым этапе Лігі чэмпіёнаў барысаўскага БАТЭ. Восень даўно мінула, скончыліся адпачынкі ў футбалістаў, і БАТЭ сутыкнуўся з суровай рэальнасцю беларускага міжсезоння. Многія гульцы каманды выправілі памяняць жоўта-сінія майкі БАТЭ на салідныя кантракты ў замежных клубах.

Дзесьці з другой паловы 1990-х, калі ўжо скончылася гегемонія мінскага «Дынама», пачаліся дыскусіі, ці патрэбен нашай краіне суперклуб, які хай і не будзе мець канкурэнцыі на ўнутраным фронце, але будзе з годнасцю прадстаўляць краіну на міжнароднай арэне. Зрэшты, палеміка не выходзіла за рамкі газетных публікацый, а сітуацыя была такой, што больш за дзесяць гадоў ніводзін айчынны клуб не мог выйграць нацыянальнае першынство хаця б два разы запар. Некаторыя былыя чэмпіёны, як бабруйская «Белшына» і мазырская «Славія», увогуле бясслаўна барахтаюцца ў хвалях першай лігі.

Тым часам базавыя клубы для нацыянальных зборных пачалі стварыць міністр унутраных справаў Уладзімір Навумаў у хакеі і на сёння беспрацоўны Уладзімір Канаплёў у гандболе. Зрэшты, параўноўваць фінансавыя затраты на гандбольны і футбольны клуб не зусім карэктна. Скажам, гадавы бюджэт срэбранага прызёру футбольнага чэмпіянату Расіі маскоўскага ЦСКА складае 51 мільён даляраў. У наймацнейшай еўрапейскай гандбольнай каманды — іспанскага «С'юдад Рэала» — бюджэт складае прыкладна 6,5 мільёнаў даляраў.

Паводле звестак УЕФА, гадавы бюджэт БАТЭ роўны толькі 5—5,5 мільёнаў даляраў. Англійскі Guardian ацэньвае яго яшчэ больш сціпла — 2,2 мільёны. Генеральны дырэктар БАТЭ Анатоль Капскі заяўляў, што пасля выхаду каманды ў групавы этап Лігі чэмпіёнаў яе бюджэт павялічыцца ў два разы. Але гэтага ўсё адно малавата нават для еўрапейскага сярэднячка.

А тое, што ў футболе грошы граюць, калі не галоўную, дык адну з вызначальных роляў, ні для каго не сакрэт. Канечне, поспехаў могуць дабівацца і каманды-Папялушкі, кшталту нашага БАТЭ, а найбагацейшы клуб свету «Манчэстэр Сіці» змагацца за выжыванне ў англійскай прэм'ер-лізе, але хутчэй прыватныя моманты.

Такім чынам, спадзявацца захаваць БАТЭ ўзору 2008 было маларэальным. Перад гульцамі адразу замільгацелі прывабныя перспектывы новых кантрактаў.

Першым стан каманды пакінуў найлепшы гулец мінулага нацыянальнага першынства бамбардзір Віталь Радзівонаў. Некаторыя італьянскія СМІ пісалі, што цікавасць да нападніка праяўляе легендарная мюнхенская «Баварыя». Была цікавасць да Радзівонава і з боку бухарэсцкага «Сцяўа».

Урэшце Віталь аказаўся ў шэрагах клубу Другой нямецкай Бундэслігі «Фрайбургу». Каманда значыцца ў лідэрах дывізіёну і рэальна прэтэндуе на павышэнне ў класе. Але многія палічылі, што ўзровень Другой нямецкай Бундэслігі не адпавядае класу Радзівонава. Зрэшты, гэта выдатная пляцоўка, каб засвяціцца перад іншымі працадаўцамі.

Генадзь Блізнюк пайшоў дарогай Радзівонава, таксама заключыўшы кантракт з клубам Другой Бундэслігі. Аднак «Франкфурт» Блізнюка пасля першага кругу займаў апошняе месца. Зрэшты, Блізнюк браўся з канкрэтным разлікам дапамагчы камандзе захавацца ў дывізіёне. Ужо ў першай афіцыйнай гульні за «Франкфурт» светлагорац выйшаў у асноўным складзе і забіў адзін з чатырох галоў ягонай каманды.

Выбар Блізнюка можна растлумачыць яшчэ тым, што гэта ўжо не самы малады гулец. Прапанова «Франкфурту» была ці не апошнім шанцам форварда пагуляць у Еўропе.

Аднак найбольш гучны кантракт з гульцоў БАТЭ ў мінулую пятніцу заключыў 21-гадовы Міхаіл Сівакоў. Яго за 800 тысяч еўра набыў італьянскі «Кальяры» з востраву Сардзінія. Гэта чацвёрты беларус у італьянскай Серыі А (першымі былі Сяргей Алейнікаў, Сяргей Гурэнка, Віталь Кутузаў).

Напэўна, Сівакову не ўдасца з ходу прабіцца ў асноўны склад астравіцян, але пры добрым падыходзе да справы ён можа дасягнуць славы Аляксандра Глеба. На сённяшні дзень «Кальяры» займае ў італьянскім чэмпіянаце сёмае месца, а ў апошнім туры сенсацыйна перайграла турынскі «Ювентус».

Іншае маладое дараванне БАТЭ, адкрыццё Лігі чэмпіёнаў Павал Няхайчык прыняў рашэнне яшчэ на сезон застацца ў Барысаве. Галоўнае, каб не заседзеўся на радзіме.

Абаронца Анры Хагуш знаходзіцца на прагляедзе ў чэмпіёна Расіі казанскага «Рубіна». Абхазцам Хагушам цікавіліся ЦСКА, «Зеніт», «Ювентус», але цану ў мільён еўра ніхто не пацягнуў.

Хагуша за сваю манеру гульні, нежаданне саступаць, спартовую злосць часта параўноўваюць з чэмпіёнам свету італьянцам Джэнара Гатуза. Анры, дарэчы, заяўляў пра сваё жаданне выступаць за зборную Беларусі. Аднак федэрацыя не дужа такі варушыцца, каб даць каўказцу сіні пашпарт грамадзяніна Беларусі.

Капітан БАТЭ Аляксандр Ермаковіч прыняў рашэнне павесіць буцы на цвік, перайшоў на трэнерскую працу. Максім Жаўнерчык заключыў кантракт з краснадарскай «Кубанню», Антон Сахараў — з навараcійскім «Чарнаморцам». Уладзіслаў Мірчаў вярнуўся ў «Спартак» з Варны. Віталь Казанцаў спрабуе ўладкавацца ў самарскіх «Крылах Саветаў».

Не губляюць яшчэ надзеі працаўладкавацца за мяжой паўабаронцы нацыянальнай зборнай Сяргей Крывец і Ігар Стасевіч, але іх шанцы з кожным днём змяншаюцца.

На новыя месцы ў БАТЭ ўжо прыйшлі цемнаскуры расійскі нападнік гродзенскага «Нёману» Аляксандр Алумона, абаронца маладзевай зборнай Беларусі Максім Бардачоў, а таксама крэатыўны хаўбек нацыянальнай каманды Аляксандр Паўлаў, які не падышоў чачэнскаму «Цераку».

Вядуцца перамовы наконт пераходу ў барысаўскую дружыну Дзмітрыя Мазалеўскага з брэсцкага «Дынама».

Сезон-2009 БАТЭ пачне ў значна абноўленым складзе. Зусім не той камандай, за якую мы перажывалі восенню мінулага году. Гэта пакуль аб'ектыўная рэальнасць нашага футболу. Грошай на суперкаманду ў нас пакуль няма.

**Зміцер Панкавец**

# Ірына Абельская жывая

Апошнім часам сталі з'яўляцца чуткі пра кепскі стан здароўя некаторых асобаў у прэзідэнцкім атачэнні. Спачатку ў гэтых чутках фігураваў Віктар Шэйман, потым Дзмітрый Паўлічэнка.



Цяпер, калі высветлілася, што з імі ўсё ў парадку, «чорныя» пагалоскі папаўзлі наконт Ірыны Абельскай **(на фота)**, асабістай дактаркі кіраўніка краіны.

Нягледзячы на пустапарожнасць ранейшых чутак сайт belmy.info усё ж вырашыў праверыць і гэтую. У аддзяленні ультрагукавой дыягностыкі Мінскага гарадскога кансультацыйна-дыягнастычнага цэнтру, дзе працуе былая галоўная доктарка Рэспубліканскай лякарні Упраўлення справамі прэзідэнта, паведамілі: «Вы не першыя тэлефануеце. Яна жывая!»

**Барыс Жаўткоў, belmy.info**

# Аты-баты, забралі лідэраў у салдаты

**Падчас зімовага прызыву–2009 у войска трапілі яркія моладзевыя лідэры — Франак Вячорка, Іван Шыла і Зміцер Хведарук. Прысягу хлопцы прымуць 7 лютага.**




У войска пад канвоем.

Масавую аблаву на маладзёнаў зладзілі 28 студзеня, за тры дні да канца прызыўной кампаніі. Дарэчы, не супадзенне, што напярэдадні хлопцам прысвяцілі сюжэты лукашэнкаўскія тэлеканалы, а ў той самы дзень друкаваны орган Адміністрацыі прэзідэнта газета «Советская Белоруссия» змясціў матэрыял пра Шылу і Вячорку.

Выключаны летась з журфаку БДУ Франак падаваў скаргу ў суд, што ягоны прызыў праходзіць з мноствам парушэнняў заканадаўства. Зрэшты, ніхто да ягоных довадаў прыслухоўвацца не збіраўся. 23 студзеня суд Савецкага раёну Мінску прызнаў Вячорку годным для службы ў войску, самога хлопца нават не запрасілі на працэс.

28 студзеня яго проста вылавілі на вуліцы, адвезлі ў ваенкамат і зачыталі пастанову, што «прызыўнік Вячорка накіроўваецца ў вайсковую частку для праходжання тэрміновай службы».

Актывіст змог дазваніцца да бацькі, аднак, калі Вінцук Вячорка прыехаў у ваенкамат, падпалкоўнік Загурскі паведаміў яму, што Франак ужо адбыў у Баранавічы, для службы ў 8-й радыётэхнічнай брыгадзе. Частка вядомая тым, што акурат з яе аддаваўся загад расстраляць паветраны шар з амерыканцамі, які занесла ў Беларусь у сярэдзіне 1990-х.

Ля кватэры Івана Шылы ў Салігорску ў сераду міліцыянты дзяжурылі ад самай раніцы, але актыўныя дзеянні яны пачалі бліжэй да шостай вечара. Паказалі санкцыю намесніка пракурора Салігорскага раёну сп.Бельчынам, на правядзеннеператрусу ў кватэры. Калі дзверы адамкнулі, Івана адразу затрымалі і даставілі ў ваенкамат.

Тым часам да ваенкамату тэрмінова пачалі сцягвацца медыкі, хоць працоўны дзень даўно скончыўся. Прыкладна а 21-й ваенкомаўская камісія прызнала Івана годным да службы.

Вечарам яго накіравалі ў Мінскі абласны ваенкамат. Адкуль ужо потым размеркавалі ў распараджэнне 29-й зенітна-ракетнай брыгады ў вёсцы Межыца Лепельскага раёну. Там жа служыць былы лідэр «Моладзі БНФ» Алесь Каліта. Ён ужо «чэрап» — адслужыў паўгоду.

Вечарам таго ж дня міліцыянты прыйшлі ў кватэру яшчэ аднаго сябра «Маладога фронту» — Зміцера Хведарука. Спачатку бацька адбіў сына ад праваахоўнікаў, але тыя прыйшлі паўторна. Хведарука таксама спачатку адвезлі ў ваенкамат, а потым у РУУС Першамайскага раёну Мінску. Там успомнілі, што Зміцер не адбыў 10-сутачны арышт яшчэ аж за акцыю 1 траўня.

Маладзёна адвезлі начаваць на Акрэсціна. Адкуль на наступны дзень завезлі ў паліклініку праходзіць медкамісію. Яна таксама прызнала хлопца годным. І ўжо ў пятніцу Зміцер прыбыў у транспартныя войскі ў Жодзіна.

Калі прызыў Шылы і Вячоркі можна было спагназаваць — хлопцаў адмыслова выключылі з універсітэту і школы, то з Хведаруком атрымалася поўная нечаканасць. Хлопец вучыўся на першым курсе пратэстанцкага Біблійнага каледжу, але ў ваенкамаце заявілі, што ў навучальнай установы скончылася ліцэнзія.

Бацькі і паплечнікі ў першыя дні спрабавалі наведаць навабранцаў у вайсковых частках, але паўсюль сутыкаліся з адмовамі — да прысягі нельга.

Адзінай крыніцай інфармацыі пра палітычных актывістаў стала... Беларускае тэлебачанне. Здымачная група «Панарамы тыдня» ўжо наведала вайсковыя часткі Вячоркі і Шылы.

Франак прадэманстраваў апарату сваю новую прычоску «нулёвачку», а таксама даў невялічкае інтэрв'ю, дзе паведаміў, што пакуль вагаецца, ці варта прымаць прысягу, бо лічыць прызыў незаконным. Схіляецца да таго, што прыме, бо гэта дасць магчымасць атрымліваць звальненні, а таксама нармальна кантактаваць з бацькамі.

Іван Шыла з БТэшнікамі не размаўляў. Затое былі прадэманстраваныя эксклюзіўныя кадры, калі Шылу стрыгуць налыса, першая мерка вайсковага бушлата, а таксама абед у сталоўцы бульбай з катлетамі. А напрыканцы была выказаная ўпэўненасць, што за такога байца вайсковай часці сорамна не будзе.

Такім чынам, за адзін дзень улады разам пазбавіліся на паўтара году ад трох моладзевых лідэраў, якія б былі здольныя павесці за сабой вулічныя акцыі. Гэта таксама і знак усёй палітычна актыўнай моладзі. Будзеце ўдзельнічаць у супраціве — пойдзеце ў боты.

Ствараецца ўражанне, што ўлады прагназуюць рост сацыяльнай напружанасці і банальна спрабуюць на прыстойнай падставе ізаляваць патэнцыйных вулічных лідэраў. Нават цаной псавання ўласнага іміджу і дадачы станоўчага іміджу хлопцам. А дзембель непазбежны, як любяць казаць самі салдаты.

**Зміцер Панкавец**

# Парадоксы віленскай беларускай школы

**90-годдзе беларускай школы ў Вільні.**

Беларускай школе імя Францішка Скарыны ў Вільні 31 студзеня споўнілася 15 гадоў. Калі лічыць ад даты заснавання Віленскай беларускай гімназіі, утворанай у 1919 годзе, то атрымаецца цэлых 90 гадоў. «Мы лічым сябе спадкаемцамі беларускай школьнай традыцыі ў Вільні», — тлумачыць дырэктарка школы Галіна Сівалава.

На святкаванне ў Дом настаўніка прыйшло многа гасцей: навучэнцы, іх бацькі і педагогі, палітыкі і дыпламаты, мясцовыя беларусы. Заля гула рознымі мовамі, сярод якой пераважала ўсё ж беларуская, зусім як тыя дзевяноста гадоў таму. На сцэну выйшлі вядоўцы ў шаблонных беларускіх касцюмах і прывіталі прысутных правільна пастаўленай мовай са строга-школьнай інтанацыяй. Узяла слова дырэктарка, спадарыня Галіна, якая павіншавала школу і падкрэсліла яе значнасць у межах Літвы і не толькі, адзначыўшы, што любові да роднай мовы і культуры школа навучылася менавіта ў літоўцаў.

Падзякі беларускай дзяржаве за падтрымку плаўна пераліліся ў выступ пасла Беларусі ў Літве і па сумяшчальніцтве Фінляндыі Уладзіміра Дражына. Добрай беларускай мовай дыпламат адзначыў важнасць працы школы, пажадаў і надалей захоўваць сваю мову і беларускасць, паабяцаўшы: «Радзіма будзе клапаціцца і дапамагаць». У падарунак ад пасольства прыпаднесла тэлевізар «Гарызонт» апошняй мадэлі і ўшанавала граматай найлепшую навучэнку.

Праграму працягнулі выступы навучэнцаў з вядомымі беларускімі песнямі. Музычнае і візуальнае афармленне прэзентацый беларускай культуры не надта змянілася за апошнія трыццаць гадоў, як, пэўна, і ўспрыманне нацыі не вышэй за «фальклорную асаблівасць народнасці». Значны кантраст стварылі музычныя нумары навучэнцаў літоўскай і польскай школаў, якія артыстычна выконвалі сучасныя кампазіцыі на родных мовах.

Адзін з выпускнікоў школы, Артур Баер, стаў вядомым у Літве танцорам. З нагоды юбілею таленавіты выпускнік падрыхтаваў з навучэнцамі некалькі танцавальных нумароў, якія гледачам, бадай, спадабаліся найболей. А Павел Сівалаў, сын дырэктаркі і былы навучэнец, адзначыў, што ў Беларусі людзі здзіўляюцца яго беларускай мове і не маюць такой павагі да яе. Віляйнай неспадзяванкай для ўсіх было імправізаванае запрашэнне выпускнікоў выйсці на сцэну і праспяваць «песню, якую яны ўсе ведаюць». І шэраг маладых людзей ладна заспяваў «Пагоню».

— Мы часта спяваем гэтую песню, — расказвае «НН» спадарыня Галіна Сівалава, — аднойчы дзеці завялі «Пагоню» на школьным свяце, а папярэдні пасол Уладзімір Гаркун, што сядзеў на першых шэрагах, расчуліўся і нават пусціў слязу... Так, нас шмат хто крытыкуе за пэўныя крокі, але мы нясупраць мяняцца. Калі ёсць нехта, хто ведае, як зрабіць лепей — прыходзьце, мяняйце! Пакуль мы мусім існаваць у такіх вось умовах.

Такая парадаксальная сітуацыя. Спяваючы пра «Пагоню», дзеці атрымліваюць граматы з зусім іншым гербам. Гэта як прыпеўка, якую выконвалі малодшакласнікі падчас канцэрту. Час ідзе, а мы ўсё тыя ж, і не больш:

> «Цік-так, ходзікі,
> Пралятаюць годзікі,
> Чуб ільняны, светла-русы,
> Тата з мамай — беларусы...»

**Стася Мініч,**
**Вільня**

**Віленская беларуская гімназія** была створана ў 1919. Яна размяслілася ў Базыльянскіх мурах, побач з праваслаўнай семінарыяй і музеем Івана Луцкевіча, які быў арганізатарам школы. Акром абавязковых прадметаў навучэнцы наведвалі культурна-мастацкія і моўныя (нават па эсперанта) гурткі. Дзейнічаў духавы аркестр, хор пад кіраўніцтвам вядомага беларускага дырыжора Рыгора Шырмы. Выдавалася газета «Вучнёвы звон». Выпускнікі не атрымлівалі дзяржаўнага атэстату, што стварала цяжкасці для іх. У 1932–1933 гімназія набыла статус дзяржаўнай, стаўшы філіялам польскай гімназіі. У 1944 гімназія была зачыненая савецкімі ўладамі. Сярод выкладчыкаў былі Антон Луцкевіч, Браніслаў Тарашкевіч, Максім Гарэцкі, Францішак Аляхновіч. У гімназіі вучыліся Наталля Арсеннева, Барыс Кіт.

Віленская беларуская школа ў раёне Каралінішкі была заснаваная ў 1994 як спроба аднавіць традыцыі легендарнай гімназіі. Цяпер школа налічвае каля 130 навучэнцаў. 70% з іх — беларусы. Заняткі праходзяць па-беларуску і па-літоўску, каб падрыхтаваць дзяцей да выпускных экзаменаў на дзяржаўнай мове. Наладжаныя адукацыйныя сувязі з ВНУ Беларусі, куды выпускнікі пры жаданні паступаюць. Школа мае свае традыцыі. Напрыклад, за сто дзён да апошніх экзаменаў 12-цікласнікі ядуць «апошнюю дзіцячую кашу», а першакласнікі падсалоджваюць яе варэннем, сімвалам лёгкага і салодкага жыцця пасля школы.

# Блогер: Вячорку і Шылу трэба трактаваць як палітвязняў

Піша **nescerka.livejournal.com**.

Пастаноўка пытання, што яны не хочуць служыць, калі ўсе служаць, абсалютна левая. Гэтак на службу ні прынца Гары, ні Элвіса не заганялі. Калі чалавека спачатку без дай прычыны выганяюць з ВНУ і школы, потым падрабляюць вынікі агляду — гэта злачынствы. А значыць, Франака і Шылу цяпер адназначна трэба трактаваць як палітвязняў. І каб спыніць гэтае бязмежжа, «Міжнародная амністыя» павінна іх абвесціць вязнямі сумлення. Раптам да 13 красавіка і адчэпяцца.

Сёлета, як і кожныя паўгоду, дзесяткі тысячаў хлопцаў абулі боты і пайшлі служыць у войска згодна з законам. І дзесяткі тысячаў такіх жа хлопцаў згодна з тым жа законам служыць не пайшлі. І іх ніхто не лічыць ані здраднікамі, ані зажэрамі. Пытанне Франака Вячоркі ды Івана Шылы — не ў тым, што гэтыя людзі ўхіляюцца ад свайго абавязку, а ў тым, што ў дачыненні да іх груба парушаюцца Канстытуцыя і законы, што не можа быць апраўдана палітычнымі ці іншымі меркаваннямі. Калі ўлада ізалюе палітычных апанентаў, не важна, праз турму ці праз іншы рэпрэсіўны інструмент, апошнія робяцца вязнямі сумлення.

**Блог**

**дзённік, які вядзецца ў інтэрнэце ў адкрытым доступе. Nescerka — адзін з самых папулярных аўтараў беларускага сеціва.**

# Трымайся і не давайся

**Ёсць людзі, якія моцна адчуваюць справядлівасць і жыццёвы сэнс і не хочуць губляць сваю чалавечую сутнасць. Неабавязкова гэта людзі адукаваныя, і вельмі часта яны негаваркія. Але нярэдка гэта людзі маладыя. Піша Наталка Бабіна.**

Івана Шылу я ведаю мала, сустракаліся мы толькі два разы. На сустрэчы з чытачамі ў Салігорску год таму сям'я Шылаў — бацька і два сыны — звярнулі на сябе маю ўвагу. Прыгожыя, падобныя адзін на аднаго, з разумнымі вачыма і тварамі, поўнымі годнасці, — нельга было іх не заўважыць.

На мінулы Дзень Волі мы пабачыліся з Іванам зноў: ён прыехаў у Мінск і, скарыстаўшыся выпадкам, папрасіў падпісаць кнігу. За гарбатай трошкі пагаварылі. Я распытвала яго пра вучобу, сям'ю, сказала, што была шакаваная фотаздымкам выпадку, калі, разганяючы чарговы пікет, двое здаравязных міліцыянтаў «прыклалі» ягонага брата аб асфальт... Ён пільна зірнуў на мяне і адказаў адной фразай: «Нічога, мужчына павінен быць моцным і ўмець трываць боль».

А потым была падласць году: Івана выключылі са школы перад апошнім экзаменам. Міністр адукацыі Радзькоў праз паўгоду патлумачыў, чаму менавіта: «Заўтра экзамены здаваць, а ён улёткі расклейвае, прычым самага непрыстойнага зместу», — сказаў грамадзянін, які ў Беларусі ўзначальвае сістэму адукацыі, на прэс-канферэнцыі, якая адбылася 22 студзеня.

Думаю, за Івана тады перажывалі ўсе, хто даведаўся пра гэта, найперш ягоныя настаўнікі... Ці не зломіцца, ці зможа будаваць жыццё далей?

Не зламаўся.

Так склалася, што ў гэты прыкладна час я пазнаёмілася з яшчэ адным чалавекам — 75-гадовым Уладзімірам Леанюком родам з вёскі Крытышын, што на Брэстчыне. У 1952 годзе ўлады таксама не далі яму скончыць школу: у апошнім класе школы яго арыштавалі за тое, што перапісваў ад рукі антысавецкія лістоўкі, і асудзілі на 25 гадоў. Ягоных бацькоў-сялянаў выслалі ў Казахстан, таму ў турму да хлопца прыходзіла не родзічка, а чужая старая жанчына, якая жыла ў іх «у наймах», — памагала абрабляць гаспадарку. І гэтая старая непісьменная жанчына з глухой вёскі кожны раз, развітваючыся, гладзіла хлопца па галаве, хрысціла і казала: «Дытыно, трымайся і не давайся»...

Я гляджу на свайго маленькага сына, і сэрца халадзее. Я хачу выхаваць яго такім, як Іван: чалавекам, які ведае, што справядліва і ў чым ягоная чалавечая сутнасць. І хачу ганарыцца ім так, як ганарацца сынам бацькі Івана.

І разумею, што і тады, калі ён вырасце, зло не адступіцца, хаця і прыме новыя формы. І зноў трэба будзе, каб нейкая жанчына казала: «Дытыно, трымайся і не давайся».

## Пазняк: Каб ратаваць краіну, трэба не падтрымліваць рэжым, а знішчыць яго

Небяспеку для незалежнасці Беларусі ўяўляе не крызіс, а існы антыбеларускі рэжым. Каб ратаваць краіну, трэба не падтрымліваць рэжым, а знішчыць яго. Трэба скарыстаць крызіс, каб ліквідаваць уладу цемры. Беларусам даецца шанц. Пасля крызісу павінна стаць выздараўленне. Але патрабуецца толькі адно — хваробу перамагчы.

**З артыкулу на bielarus.net**

## У сувязі са стварэннем кансультацыйнае рады пры адміністрацыі Лукашэнкі

Заява прэзідыуму Палітрады АДС.

У апошні час у асобных як незалежных, так і дзяржаўных СМІ з'явілася інфармацыя аб пашырэнні кантактаў улады з прадстаўнікамі дэмакратычнай апазіцыі.

У прыватнасці, аб уключэнні прадстаўнікоў шэрагу палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў, што ўваходзяць у АДС, у Грамадска-кансультацыйную раду пры Адміністрацыі прэзідэнта, якую ўзначаліў кіраўнік Адміністрацыі Уладзімір Макей. У сувязі з гэтым прэзідыум Палітрады АДС лічыць неабходным заявіць:

— ніякіх афіцыйных прапановаў аб накіраванні сваіх прадстаўнікоў у вышэйназваную Раду суб'екты АДС не атрымлівалі;

— статут, паўнамоцтвы і склад названай структуры застаюцца незразумелымі;

— ацэнку дадзенаму органу можна будзе даць толькі зыходзячы з пэўнага выніку яго дзейнасці ў дэмакратызацыі ўсіх сфер грамадска-палітычнага жыцця.

Прэзідыум таксама заяўляе, што дэмакратычныя сілы гатовыя да адкрытага транспарэнтнага дыялогу з уладамі па актуальных праблемах, якія хвалююць беларускае грамадства, што адлюстравана ў стратэгіі дзейнасці АДС, прынятай на апошнім Кангрэсе прыхільнікаў дэмакратычных перамен у 2007 годзе.




**Актывісты «Маладога Фронту» 2 лютага пікетавалі Міністэрства абароны.**

ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## «Жаўнеры БНР» праедуць па краіне

**14—17 лютага** ў розных гарадах краіны пройдзе шэраг прэзентацый новае кнігі выдатнага сучаснага гісторыка, праф. Алега Латышонка «Жаўнеры БНР» з удзелам аўтара. Гэта вычарпальны збор працаў, прысвечаных незалежніцкім вайсковым фармаванням 1918—1921 гадоў. Частка сустрэчаў пэўная, частка — на стадыі ўзгаднення. Калі ласка, сачыце за абвесткамі ў інтэрнэце і распытвайцеся ў мясцовых супольнасцях.

**16 лютага — Менск, Гістарычная майстэрня, вул.Сухая, 25, 18.00.**

**17 лютага — Горадня, заля Таварыства беларускай школы, вул.Будзённага, 18.30.**

Сустрэчы мяркуюцца таксама **ў Полацку, Магілёве, Баранавічах**.




**АД РЭДАКЦЫІ**

### Чым каментары розняцца ад артыкулаў?

Новыя чытачы «НН» заўважылі, што ў газеце даволі шмат палосаў, што называюцца «Каментары». Гэта робіцца для таго, каб аддзяліць аб'ектыўныя артыкулы, напісаныя супрацоўнікамі Рэдакцыі, ад матэрыялаў суб'ектыўнага характару. Іх пішуць як журналісты «НН», так і аўтары не з газеты. Яны могуць насіць дыскусійны характар. У іх фармулююцца новыя ідэі.

# Крызіс не цётка

**Макей узначаліў, Рух за Свабоду запрошаны. Пры Адміністрацыі прэзідэнта ствараецца Грамадска-кансультацыйная рада, у якую маюць увайсці і некалькі фігураў з апазіцыі.**

У яе маюць увайсці прадстаўнік Руху за Свабоду, Алег Трусаў, Станіслаў Багданкевіч, Уладзімір Нісцюк, Леанід Заіка.

Узначальвае Раду кіраўнік Адміністрацыі прэзідэнта Уладзімір Макей. Асноўныя мэты — абмеркаванне актуальных пытанняў развіцця дзяржавы і грамадства, выпрацоўка прапановаў па больш актыўным далучэнні да агульнасусветных працэсаў, удасканаленне кірункаў сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця краіны.

Вядома, што ў склад Рады пагадзіліся ўвайсці многія прадстаўнікі незалежнага грамадства. Першым да супрацы запрасілі Беларускі Хельсінскі камітэт, таму і пайшла інфармацыя, што рада найперш будзе займацца пытаннем правоў чалавека, але гэта не зусім адпавядала рэчаіснасці.

Потым стала зразумела, што аналагічныя прапановы атрымалі і прадстаўнікі палітычных сілаў. У прыватнасці, тэлефонны званок з Адміністрацыі паступіў у офіс Руху за Свабоду. «Была вусная прапанова ўвайсці ў склад Рады. Мы расцэньваем яе не як персанальную прапанову Аляксандру Мілінкевічу, а ўсяму Руху. Хто менавіта будзе прадстаўляць нас у Радзе, пакуль не вырашылі. Але што пагодзімся на ўдзел, то без сумневаў. Спадзяемся, што па магчымасці будзем уплываць на прыняцце рашэнняў», — кажа намеснік Мілінкевіча па Руху за Свабоду Віктар Карняенка.

Тэлефанавалі з Адміністрацыі і старшыні Таварыства беларускай мовы Алегу Трусаву. «Так, я пагадзіўся. Адзінай умовай паставіў, што справаводства ў Радзе павінна весціся і на беларускай мове. Яны адразу пагадзіліся. Ад удзелу ў падобных групах мы нічога не прайграем, а выйграць можна вельмі многае. ТБМ ніколі не баялася супрацоўніцтва з уладамі. Вось літаральна пару дзён таму меў сустрэчу з Аляксандрам Зімоўскім», — кажа А.Трусаў.

Вядома, што персанальнае запрашэнне прыйшло былому кіраўніку Нацбанку, ганароваму старшыню АГП Станіславу Багданкевічу. Ён, у прынцыпе, таксама не супраць.

Даў сваю папярэднюю згоду і блізкі да ўладаў сацыял-дэмакрат Уладзімір Нісцюк.

Старшыня БСДП, сяброў якой не запрасілі ў Раду, Анатоль Ляўковіч пацікавіўся, а каго будзе там прадстаўляць Нісцюк, бо цяпер ён беспартыйны. Нісцюк сказаў, што — «выпускнікоў Суворaўскіх і Нахімаўскіх вучэльняў».

Будзе ў Радзе і папулярны эканаміст Леанід Заіка, прадстаўнік прафсаюзаў Аляксандр Ярашук. Намеснік старшыні Партыі БНФ Віктар Івашкевіч пацвердзіў, што ад партыі ад АДС нікога з Адміністрацыі не запрашалі.

Ад новага году розных радаў і камісій з удзелам прадстаўнікоў незалежнага грамадства парабілі нямала. Тут табе і Вардамацкі ва ўрадавай камісіі па маркетынгу, і Сярэдзіч у радзе пры СМІ, і Мілінкевіч, якога запрашае да супрацы Адміністрацыя прэзідэнта. Але пакуль што ад гэтых камісій адзін пыл у вочы.

У тым асабіста пераканаўся эканаміст, выканаўчы дырэктар аналітычнага цэнтру «Стратэгія» Яраслаў Раманчук, які прыняў рашэнне выйсці з складу ўрадавай групы па краінавым маркетынгу.

Усяго адбылося адно паседжанне 26 студзеня, дзе намеснік міністра замежных справаў А.Еўдачэнка прэзентаваў план праекту па краінавым маркетынгу. Заўвагі Раманчука па дадзеным дакуменце былі цалкам праігнараваныя.

«Разумеючы важнасць дадзенай праблематыкі, выражаючы жаданне дапамагчы краіне ў пераадоленні крызісных з'яваў, я даў згоду на ўдзел у працы дадзенай урадавай камісіі. Аднак удзельнічаць у пустаслоўі пры намесніку міністра я не збіраюся», — заявіў Я.Раманчук.

**Зміцер Панкавец**

# Дзень Волі-2009

**Ад Акадэміі навук да Кастрычніцкай.**

2 лютага лідэры БНФ падалі заяўку ў Мінгарвыканкам на правядзенне 25 сакавіка традыцыйнага шэсця, прымеркаванага да 91-х угодкаў абвяшчэння незалежнасці Беларускай Народнай Рэспублікі.

Заяўнікі просяць даць афіцыйны дазвол на збор а 18-й ля Акадэміі навук і шэсце праспектам Незалежнасці да Кастрычніцкай плошчы. Заяўнікі акцыі настойліва просяць «не прапаноўваць чарговы раз маршрут Сурганава—Бангалор».

Сёлетняя акцыя пройдзе пад лозунгам «За праўду! За справядлівасць! За свабоду!», а таксама з патрабаваннямі сыходу Лукашэнкі ў адстаўку, правядзення новых выбараў і стварэння ўраду народнага даверу.

Арганізатары акцыі заклікалі шырокія палітычныя сілы далучыцца да акцыі. Віктар Івашкевіч выказаў спадзеў, што на акцыю масава прыйдуць рабочыя і службоўцы, «паколькі цяжкі фінансавы стан закрануў усіх».

**Зміцер Панкавец**



# Нячэсны крыж

**У Лельчыцах уладам не спадабалася, што каталікі паставілі крыж на ростанях.**

Аднак раённы суд спачатку ўзяў бок святара. У сераду адбудзецца яшчэ адзін суд.

У кастрычніку 2008 г. пробашч Лельчыцкай каталіцкай парафіі ксёндз Віталь Мышона атрымаў дазвол на ўсталяванне крыжа на ўездзе ў горад. «Мы дабіваліся гэтага каля пяці гадоў, але безвынікова», — кажа а.Віталь. Дазвол далі толькі калі ў райвыканкаме змяніўся чыноўнік, адказны за справу. Паводле прадпісання райвыканкаму, усталяванне крыжа было ўзгодненае ў ДАІ і ДСУ, а на імя старшыні была напісаная адпаведная заява. Атрымаўшы станоўчы адказ, парафіяне асвяцілі крыж у гонар святога Канстанціна — імператара, які, паводле падання, у 313 годзе перад рашучай бітвай пабачыў у небе крыж. Канстанцін перамог і зрабіў хрысціянства дзяржаўнай рэлігіяй Рымскай імперыі. На лельчыцкім крыжы ёсць цытата лацінай з таго падання — «In hoc signo vinces» («У гэтым знаку ты пераможаш»).

Аднак па пэўным часе ксяндза выклікалі ў райвыканкам, дзе паведамілі, што працэдура ўсталявання патрабавала таксама ўзгаднення з раённым архітэктарам.

Парафіі было зробленае прадпісанне зрабіць праект, узгадніць яго з архітэктарам і зямельнымі службамі. «Парафіяне ўжо пачалі рыхтаваць неабходныя дакументы, але тут раённы архітэктар заявіў, што складае на мяне пратакол за тое, што я не ўзгадніў з ім гэтае пытанне», — прыгадвае а.Віталь.

Адбыўся суд, які, аднак, прызнаў, што ксёндз і парафіяне не выйшлі ў сваіх дзеяннях за рамкі патрабаванняў райвыканкаму і такім чынам закон не парушылі. Справу спынілі. Але гэта не спыніла чыноўнікаў — архітэктар склаў чарговы акт, а начальнік раённай землебудаўнічай і геадэзічнай службы абвінаваціў ксяндза ў самавольным захопе зямельнага



ўчастку. Касцёлу прадпісалі вызваліць зямлю да 31 студзеня альбо аформіць яе адпаведным чынам. «Самі мы крыж пераносіць не будзем», — рашыў ксёндз. Так яно і выйшла. Не наважыліся бурыць крыж і ўлады, ён пакуль стаіць на ўездзе ў горад. За невыкананне прадпісання райвыканкаму ксяндза Мышона выклікалі ў суд, які адбудзецца ў сераду 4 лютага.

Са словаў святара, апошнім часам улады вельмі зацікавіліся дзейнасцю парафіі. Так, намесніца старшыні райвыканкаму Вольга Гаўрылавец, якая з'яўляецца таксама старшынёй камісіі па праверцы заканадаўства ў галіне свабоды сумлення, стала настойваць на сваёй прысутнасці на занятках нядзельнай школкі. Ксёндз, палічыўшы гэта ўмяшаннем ва ўнутранае жыццё парафіі, адмовіў. І атрымаў папярэджанне ад аблвыканкаму за перашкоду працы супрацоўнікаў райвыканкаму.

Начальнік аддзелу у справах рэлігій і нацыянальнасцяў Гомельскага аблвыканкаму Аляксандр Прусаў апраўдвае гісторыю з крыжам абурэннем мясцовых жыхароў, бо «там жыве вялікая доля праваслаўных людзей».

Карэспандэнту «НН» Вольга Гаўрылавец пракаментаваць сітуацыю адмовілася: «Вакол гэтага крыжа шмат самай рознай і надуманай інфармацыі». Раней карэспандэнту «Газеты Выборчай» Андрэю Пачобуту яна заўважыла, што «лельчыцкі ксёндз паводзіць сябе так, нібыта каталіцызм у гэтай мясцовасці — дамінуючая рэлігія».

**Сямён Печанко**

**Парафія ў Лельчыцах**

адрадзілася ў 1990, сёння складаецца з 350 чалавек. Стары драўляны касцёл згарэў у 1943. У 1998 быў збудаваны новы.

# Доктар, уратуй сябе

**Віталь Сіліцкі** палемізуе з **Лявонам Баршчэўскім** і **Анатолем Сідарэвічам**.

Пытанні, ці магчымыя эвалюцыйныя змены ў аўтарытарных сістэмах, ці прыносяць плён «жорсткія» меры сілавога ўздзеяння на іх, ці магчымыя варыянты іх «мяккай» эвалюцыйнай трансфармацыі праз механізмы эканамічнага і культурнага ўздзеяння, застаюцца актуальнымі не для аднаго пакалення палітолагаў і практыкаў. Калі гэтыя пытанні абмяркоўваюцца ў канкрэтнай сітуацыі, так, як гэта цяпер адбываецца ў Беларусі, то гэтыя дэбаты не могуць абысціся без эмоцыяў. Аднак, хацелася б, каб хоць нейкія прынцыпы прыстойнасці ў такіх дэбатах захоўваліся. Напрыклад, калі апаненты не пераходзяць лінію, дзе крытыка робіцца паклёпам, дзе ў якасці аргументаў выкарыстоўваюцца надуманыя, прыпісаныя высновы, дзе сама спрэчка ператвараецца ў палітычны працэс. Такую лінію, на мой погляд, перайшлі два паважаныя апаненты з лагеру прыхільнікаў «жорсткай лініі» да рэжыму Лукашэнкі.

Спачатку Анатоль Сідарэвіч, раззлаваны маёй крытыкай бяздзейнасці апазіцыі падчас крызісу, абвінаваціў мяне ў тым, што я не заўважаю, што краіну і ўласна апазіцыю дадзяўбаў да ручкі злачынны рэжым.

Потым Лявон Баршчэўскі абвінаваціў усіх, хто не падтрымлівае палітыку жорсткай ізаляцыі Лукашэнкі, у тым, што яны спрабуюць «ратаваць» рэжым. Цікава, што абодва крытыкі найперш пацвердзілі тое, у чым аўтар гэтых радкоў западозрыў апазіцыю, — што яны жывуць выключна мінулым днём (і Сідарэвіч, і Баршчэўскі прысвяцілі дзве траціны сваіх артыкулаў успамінам пра тое, што адбывалася ў 1990-я).

Давайце, аднак, паспрабуем разабрацца ў сутнасці абвінавачванняў.

Што азначае спрыянне «ратаванню рэжыму»?

Пад гэтым разумеецца апазіцыя да курсу на эканамічную і палітычную ізаляцыю ўлады і падтрымка замежнапалітычнага дыялогу паміж афіцыйным Мінскам і Захадам.

Таксама ў гэтую катэгорыю трапляе ўстрыманне ад крытыкі тых дзеянняў улады, якія супадаюць з нацыянальнымі інтарэсамі. Магчымасці такога супадзення апаненты не дапускаюць.

Не ўсё ў гэтай логіцы памылкова. Цалкам зразумела, што Лукашэнка пайшоў на лібералізацыю выключна ў мэтах самазахавання. Яго збліжэнне з Захадам і паслабленні ў палітычных рэпрэсіях могуць быць вельмі хутка спыненыя. Рэпрэсіі супраць лідэраў моладзі пад выглядам прызыву ў войска гэта яшчэ раз пацвярджаюць. Дый сітуацыя, якую апісаў Васіль Быкаў у апавяданні «Інтэграцыя», можа ўзнікнуць у першы ж крытычны момант, калі ўладзе прыйдзецца выбіраць, што ратаваць — сябе ці дзяржаву. Аднак ці азначае гэта, што сітуацыі, у якіх інтарэсы Лукашэнкі аб'ектыўна супадаюць з інтарэсамі Беларусі, немагчымыя? І што рабіць, калі такое супадзенне адбываецца?



Вось найбольш відавочны прыклад — перамовы пра выдзяленне стабілізацыйнага крэдыту МВФ ва ўмовах, калі адзінай альтэрнатыўнай крыніцай здабыцця фінансавых сродкаў такога памеру быў Крэмль. І калі лукашэнкаўская ўлада дзейнічала ў нацыянальных інтарэсах, то варта ўстрымацца ад атакавання такіх дзеянняў. Нават калі ёсць спакуса зарабіць ачкі на папулізме. Аднак гэтая ідэя была ўспрынятая акурат як заклік да калабарацыі і да ратавання рэжыму. Але ж факт: калі б не МВФ, Лукашэнка пацягнуўся б да Масквы і сёння ўжо быў бы закладзены «Беларуськалій» ці яшчэ што, а заўтра пачаліся б прыгатаванні да ўвядзення расійскага рубля. Ці лепш ад гэтага было б Беларусі і апазіцыі толькі таму, што горш стала б Лукашэнку?



Пра што можна казаць, калі рэакцыі АДС на такую падзею, як дэвальвацыя беларускага рубля, прыйшлося чакаць больш за два тыдні?

Дадамо, што сам пераказ аргументаў (заклік да «ратавання») даволі нацягнуты і, скажам так, некарэктны. Уцягванне беларускіх уладаў у дыялог — гэта найперш спроба паспрыяць не кансервацыі сістэмы, а палітычным і эканамічным пераменам у краіне.

Спробаў дамагчыся пераменаў эвалюцыйным шляхам, дарэчы, будзе тым больш, чым менш надзеяў на перамены будзе сыходзіць ад самой апазіцыі. Але яе курс на палітычнае самагубства, які абрала АДС з 2007 году, — гэта ўжо іншая справа.

Вядома ж, парадак дня такога дыялогу мусіць заснуўвацца на каштоўнасных патрабаваннях. Крокі на збліжэнне з афіцыйным Мінскам, эканамічныя і палітычныя выгоды мусяць быць абумоўленыя не задавальненнем меркантыльных ці геапалітычных патрэбаў пэўных дзяржаваў і блокаў (акурат такі сцэнар можна назваць азербайджанізацыяй), а прагрэсам у шанаванні дэмакратычных нормаў і правоў чалавека. Але сам той факт, што Захад камунікуе з афіцыйнымі ўладамі і нават пускае іх у Шэнген, не ёсць ані трагедыяй, ані здрадай прынцыпам. Замест таго каб атакаваць дыялог ЕС з беларускімі ўладамі, можна наўпрост паўплываць на яго парадак дня і, прынамсі, паспрабаваць дамагчыся больш сур'ёзных зменаў і адкрыцця больш шырокай ступені свабоды для палітычнай, грамадскай супольнасці і для незалежнай прэсы ўжо ў найбліжэйшы час. Напрыклад, вам не падабаецца, што Захад дае грошы рэжыму? Спрацуйце прэвентыўна і прапануйце палітыку, згодна з якой такая дапамога ці крэдыты абумоўліваліся б такімі і такімі зменамі ў гэтай і гэтай галіне.

Істынктыўнае адпрэчванне любых дзеянняў улады, якая паўтара дзесяцігоддзя праводзіла аўтарытарную і антыбеларускую палітыку, па-чалавечаму зразумелая. Аднак, з пункту гледжання палітыка, такія інстынкты хутчэй сведчаць пра адсутнасць уласнай палітычнай стратэгіі. Калі вашыя паводзіны вызначаюць не ўласныя прыярытэты і праграма, а імкненне «насаліць» апаненту ўсімі магчымымі метадамі, ваш апанент цалкам вас кантралюе, хіба толькі паводле прынцыпу ад адваротнага.

Акрамя ўласнай стратэгіі нашым апазіцыйным палітыкам не пашкодзіла б абзавесціся і дарам палітычнага прадбачання. Якія насамрэч наступствы дзеянняў, што рэжым прымае ў мэтах самазахавання? Да чаго вядуць паслабленні ў галіне медыяў, зніжэнне ўзроўню палітычных рэпрэсіяў, эканамічная лібералізацыя? Менавіта такая кволая і аднабаковая эканамічная лібералізацыя, як паказвае досвед, хутчэй вядзе да разбалансавання сістэмы і выклікае новыя перамены. Ці ёсць гэта «ратаванне» сістэмы ці яе эрозія, якой неразумна было б не спрыяць толькі таму, што яна адбываецца пад кіраўніцтвам Лукашэнкі?

Гэтак жа, мэта «ўцягвання» ўладаў у дыялог — не ратаванне рэжыму, а максімальнае пашырэнне ступені свабоды для беларускага грамадства, што дасць магчымасць для рэалізацыі іншых палітычных сцэнароў. Пытанне ў тым, ці ўзнікнуць гэтыя новыя сцэнары? Бо ўсё, што мы маем на гэты конт, гэта старыя спадзяванні, што рэжым сам скалапсуе пад цяжарам крызісу. Дарэчы, акурат гэтым могуць быць растлумачаныя і абвінавачванні ў «ратаванні рэжыму» — што шляхам дыялогу выпускаецца пара з катла і мы пазбаўляемся самага вернага шанцу на перамены. На жаль, досвед паказвае, што пад цяжарам эканамічных праблемаў можа адбыцца такое «закручванне гаек», якое прымусіць казаць ужо нават не пра кубінізацыю краіны, а пра больш небяспечны сцэнар. Дый што адбывалася, калі Беларусь сутыкалася з эканамічнымі праблемамі раней? Правільна, рост папулярнасці прарасійскіх і антыдэмакратычных сілаў.

На жаль, пачатая ў Беларусі лібералізацыя «зверху», кволая і збольшага імітацыйная, успрымаецца акурат як пагроза, бо яна можа адцягнуць увагу міжнароднай супольнасці ад апазіцыі, а не як магчымасць выкарыстаць усе «лазейкі», што адчыняюцца тут і там, для развіцця любой альтэрнатыўнай палітычнай і грамадскай дзейнасці.

Пра палітычныя магчымасці, што ўзніклі за апошнія гады, экспертная супольнасць кажа ўжо трэці год — перамены і крызісы ствараюць новую прастору для дыялогу з грамадствам. Калі становіцца зразумелым, што па-старому жыць ужо нельга, калі перамены адбываюцца насуперак волі ўлады, калі становіцца відавочным разрыў паміж «зместам» (новай палітыкай) і «формай» (старой ідэалогіяй, якая не здольная растлумачыць новую палітыку), у вас ёсць магчымасць прапанаваць грамадству лепшае, чым можа яму даць улада. Не глыбейшую чарку і любавейшую скварку, а лепшую палітыку, лепшую цывілізацыйную будучыню, лепшыя рашэнні ключавых жыццёвых пытанняў.

Атакі спадара Сідарэвіча на аўтара гэтых радкоў за тое, што ён крытыкуе апазіцыю за адсутнасць стратэгічнага бачання і пазітыўнай праграмы, і камічныя, і павучальныя ў той жа час. Мне інкрымінуецца тое, што я «не заўважаю», што гэта ўлада і апазіцыю згнабіла, і краіну давяла да таго стану, у якой яна апынулася.

Дарэчы, калісьці такой бязглуздзіцай вызначаўся вядомы спадар Оргіш, які абвінавачваў Манаева ў тым, што ён малюе нізкія рэйтынгі апазіцыі і не заўважае, што ў той няма доступу да медыяў.

Па-першае, тая паказка, што кожны народ мае той урад, які заслугоўвае, распаўсюджваецца і на апазіцыю.

Па-другое, шаноўны апанент, калі апазіцыя хоча калісьці перамагчы, яна мусіць знайсці сілы выйсці з гэтага стану і ўрэшце штосьці прапанаваць грамадству. А калі толькі шукаць апраўданні для свайго бяздзеяння і спасылацца на аб'ектыўныя прычыны, то і адбываецца, што ў Беларусі ўжо адбылося — на апазіцыю перастае ўскладаць надзеі і грамадства, і міжнародная супольнасць. Пра што можна казаць, калі рэакцыі АДС на такую падзею, як дэвальвацыя беларускага рубля, прыйшлося чакаць больш за два тыдні? (Тут трэба ўдакладніць — гэта не агульнае абвінавачванне ўсіх апазіцыйных сілаў у бяздзейнасці і некампетэнтнасці. Але тыя, хто ўсё ж такі лічаць, што прапанаваць грамадству альтэрнатыву — іх абавязак, — з дыялогу трагедыі не робяць. І гэтыя сілы ёсць як у АДС, так і па-за імі.)

Апазіцыя слушна заяўляе, што ў спробах свайго ратавання ўлада пераймае яе ўласныя прапановы, праграмы і ідэі. Але такое перайманне можа несці пагрозу апазіцыі толькі тады, калі яна ўжо страціла здольнасць генераваць і прапаноўваць альтэрнатывы, прапанаваць іншую стратэгію пераменаў і прадэманстраваць гатоўнасць узяць на сябе адказнасць за краіну.

Увогуле выглядае, што лібералізацыя проста пачынае замінаць спосабу палітычнага выжывання пэўнай часткі апазіцыі, якая прывыкла спісваць усё — і аб'ектыўныя цяжкасці, і ўласную бяздзейнасць — на Лукашэнку.

Браць удзел у гэтым самаратаванні насамрэч не хочацца гэтак жа сама, як дапамагаць ратавацца рэжыму.

**Віталь Сіліцкі**

доктар палітычных навук, дырэктар Беларускага інстытуту стратэгічных даследаванняў (Вільня).



## ДыКапрыё ў ролі Каліноўскага

Беларускі інтэрнэт скаланула паведамленне, што Галівуд рыхтуе кіно пра Каліноўскага з рэжысурай Мэла Гібсана і Леанарда ДыКапрыё ў галоўнай ролі. Дарэчы, ДыКапрыё нават вонкава трохі падобны да беларускага нацыянальнага героя.

Але — аказалася, што гэта ўсяго толькі плётка, пушчаная адным інтэрнаўтам. А шкада.

**Андрэй Расінскі**

# Азаранка абагнала Шарапаву

ў рэйтынгу WTA.

У новым рэйтынгу Сусветнай жаночай тэніснай асацыяцыі на першае месца ўзнялася пераможца Australian Open Сэрэна Уільямс. У яе цяпер 9432 балы.

Нагадаем, Сэрэна гуляла з Вікторыяй Азаранкай у 1/8 фіналу турніру, але беларуска, выйграўшы першы сет, праз нездароўе адмовілася ад барацьбы.

На другое месца з трэцяга ўзнялася расіянка Дзінара Сафіна (9150), фіналістка Australian Open. На трэцяе з першага апусцілася сербка Елена Янкавіч (8580).

У першай дзесятцы таксама: расіянкі Алена Дзяменцева (8216), Вера Званарова (6640), амерыканка Венус Уільямс (6140), расіянка Святлана Кузняцова (5510), сербка Ана Іванавіч (5492), полька Агнешка Радванска (3977). Замыкае дзесятку Надзея Пятрова з Расіі (3882 балы).

Марыя Шарапава наадварот зляцела з 9-га на 17-е месца, у яе 3030 балаў. А гэта азначае, што яе абагнала беларуска Вікторыя Азаранка. Вікторыя, праўда, зляцела на адно месца, 15-е, і мае 3166 балаў.

У першай сотні таксама Вольга Гаварцова — яна 49-я. Настасся Якімава — 103-я, Алена Дзегалевіч — 142-я, Таццяна Пучак — 154-я, Ксеня Мілеўская — 259-я.

**АГ**



Вікторыя і Сэрэна.

## З Брэсту дэпартаваныя польскія настаўнікі

31 студзеня з Брэсту былі дэпартаваныя Пётр Борань і Галіна Зайкоўская. Яны працавалі ў АКЦ «Мост», на базе якога існуе Польская грамадская школа імя Ігната Дамейкі Саюзу палякаў у Беларусі. Настаўнікі выкладалі польскую мову і гісторыю для вучняў старэйшых класаў. Падставай для дэпартацыі стала змена месца жыхарства настаўнікаў, якія перасяляліся з раней найманай кватэры ў новую арандаваную хату. Поўнае перасяленне настаўнікаў так і не адбылося, бо спецслужбы, якія назіралі (як аказалася пазней) за гэтым працэсам, імгненна выявілі парушэнне заканадаўства. Аказваецца, трэба было ў акрэслены тэрмін перарэгістравацца па новым адрасе.

Дзеянні ўладаў гараджане разглядаюць як дэманстрацыю пільнага нагляду за жыццём польскае грамады ў горадзе.

Каму патрэбны гэты скандал? Можа быць, справа нездарма адбылася напярэдадні VII з'езду Саюзу палякаў. Ён адбудзецца 14—15 сакавіка ў Баранавічах.

Абласны актыў СПБ выношыў арганізаваць нядзельныя заняткі школкі ў Тэрэспалі — польскім памежным мястэчку, а моладзь прывозіць на заняткі аўтобусам.

**МБ; інф. dzedzich.org**



## Генадзь Блізнюк забіў першы мяч за «Франкфурт»

На выхадных аднавілася першынство Другой нямецкай бундэслігі (Д-2), у якім Будуць выступаць гульцы БАТЭ Генадзь Блізнюк і Віталь Радзівонаў. Блізнюк гуляе за «Франкфурт», Радзівонаў — за «Фрайбург».

Абодва клубы першыя матчы выйгралі. Блізнюк забіў свой першы мяч у Бундэслізе.

«Фрайбург» ідзе на першым месцы пасля 18 тураў, мае 33 балы. «Франкфурт» узняўся на перадапошняе месца (16 балаў). Яшчэ адзін беларус выступае за «Аўгсбург» — Васіль Хамутоўскі. Гэтая каманда ідзе 6-й.

**АГ**

## «Люблю Беларусь»

Кампанію пад такой назвай распачаў аргкамітэт па стварэнні партыі Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя. Яна будзе прысвечана праблемам беларускай мовы і нацыянальнай культуры і будзе доўжыцца ўвесь 2009 год. Адзін з арганізатараў партыі, Віталь Рымашэўскі, кажа, што праграма-максімум кампаніі — стварыць у кожным раёне Беларусі беларускамоўны дзіцячы садок і беларускамоўную школу.

**МБ**




## З жыцця каўдыльё



**Урад Венесуэлы прыняў пастанову, згодна з якой 2 лютага, дзень прыходу да ўлады 10 гадоў таму прэзідэнта Уга Чавэса, абвешчана нацыянальным святам. «Гэта будзе днём радасці», — сказаў віцэ-прэзідэнт Рамон Карызалес.**

**МБ**


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# Начныя матыліцы

**Дзяўчаты, якія пайшлі на панэль. Хто яны, што падштурхнула іх да гэтага? Разбэшчанасць, цяжкія бытавыя ўмовы, а мо адразу тое і другое? У адным Пухавіцкім раёне іх некалькі дзесяткаў. Піша Янка Пухавіцкая.**

Падчас гарбачоўскай перабудовы, пры канцы 1980-х, на экраны СССР выходзіць мастацкі фільм з гучным назовам «Інтэрдзяўчына», ён робіць шмат шуме і выклікае шмат непаразуменняў: няўжо гэта на самай справе? Тады савецкі грамадзянін дазнаўся пра зусім іншы бок жыцця; тое, аб чым маўчалі раней улады, стала відавочным.

З тых часоў мінула больш за 20 гадоў, з наяўнасцю прастытуцыі звыкліся.

Хто яны, дзяўчаты, што выйшлі на панэль прадаваць сябе за грошы, рызыкуючы стаць цацкамі ў руках псіхічна хворых?.. Яны губляюць свой гонар і рызыкуюць згубіць не толькі здароўе, але часам і сваё жыццё.

Спрабуючы знайсці адказ на гэтае пытанне, я адправілася ў сталіцу нашай краіны.

Калі ехала ў Мінск, шчыра кажучы, баялася. Папрасіла знаёмых хлапцоў праехацца са мной у якасці целаахоўнікаў. Угаварваць іх не прыйшлося. Наадварот, тыя адгаворвалі мяне. Але задача журналістаў — распавядаць не толькі пра поспехі ў бітвах за ўраджай, але пра ўсе бакі жыцця, у тым ліку і шакуючыя. Чаму ў афіцыйна «стабільнай» краіне, як наша, прыгожыя дзяўчаты ідуць на панэль? Што гэтаму спрыяе? Разбэшчанасць? Ці безвыходнасць? А мо беднасць? Ці цяга да прыгожага і смачнага жыцця?

Паводле двайных стандартаў, уласцівых нашаму грамадству, прастытуцыяй займацца быццам бы і ганебна, але ў той жа час прыбытковасць старажытнае прафесіі абмяркоўваецца з зайздросным бляскам у вачах. А расійскія тэлесерыялы стварылі міфалагізаваны вобраз прастытуткі, які нічога супольнага з рэальнасцю не мае.

Знайсці начных матыліцаў у Мінску не складае асаблівых цяжкасцяў. Усе ведаюць, што пачынаючы ад плошчы Незалежнасці і далей уздоўж усяго праспекту, і на праспекце Машэрава, перайменаваным у праспект Пераможцаў, а таксама на ўсіх выездах з гораду, на працягу мо 10 км, сотні дзяўчат рознага веку стаяць у чаканні свайго кліента. Таму мне было не складана адшукаць хаця б адну, якая б магла распавесці пра сябе.

— Год таму да нас у вёску ў клуб прыехалі людзі з Мінску, якія цікавіліся дзяўчатамі, прыглядаліся, пыталіся адкуль, чым займаюцца, хто бацькі... Прапаноўвалі ехаць з імі у сталіцу — абяцалі добры заробак, шыкоўнае жыццё. Ім лягчэй было дамаўляцца з тымі, у каго бацькі пілі. Давалі трохі грошай, спойвалі і дамаўляліся... Такім чынам, і я апынулася на праспекце Пераможцаў...

Так распавяла мне дзяўчына, якой на выгляд гадоў дваццаць, прыгожая і прыемная ў размове. Яна, прызнацца, паламала мае стэрэатыпы аб тых жанчынах, якія займаюцца адной з самых старэйшых прафесій у свеце.

Шукаючы нашых зямлячак у Мінску, мне хацелася напісаць пра іх лёс. І раптам я даведалася ад нашай суразмоўцы, якая прадставілася Ганнай, што ехаць у Мінск нам было не абавязкова. У ходзе гутаркі тая даведаўшыся, адкуль я і што шукаю сваіх зямлячак, спытала, чаму я не захацела ўзяць інтэрв'ю ў самых Пухавічах? Ганна з усмешкай распавяла мне аб сваёй былой сяброўцы, якая раней стаяла з ёй на праспекце. Тая вярнулася дамоў у Мар'іну Горку, бо сэнсу «стаяць» у сталіцы няма. Удома можна зарабляць тыя ж грошы.

Усе спробы дазнацца ў Ганны імя гэтай дзяўчыны былі марныя, але тая згадзілася перадаць ёй мой тэлефон, каб яна мне распавяла больш на гэтую тэму. У выніку аказалася, што ў раёне не так ціха, як здавалася мне раней:

— Кліентамі з'яўляюцца людзі з грашыма. У адрозненне ад Мінску, у Мар'інай Горцы нам не трэба стаяць на вуліцы – паслугамі карыстаюцца ў асноўным пастаянныя кліенты, якія тэлефануюць і мы выязджаем на патрэбны адрас. Або па нас прыязджае машына. Калі дзяўчат мясцовых не стае, тэлефануюць да свіслацкіх і дружненскіх, якія звычайна стаяць на шашы або абслугоўваюць дальнабойную стаянку паблізу «Дукоры», але звычайна нас хапае. Калі толькі заказчык не патрабуе на аднаго кліента да трох дзяўчат. Ёсць і такія...

— Колькі гадоў дзяўчатам?

— Розныя. Ёсць і непаўналетнія, і сярэдніх гадоў... Але, зразумела, попытам карыстаюцца маладыя. І чым маладзейшыя, тым лепей.

— І што міліцыя, няўжо ні разу вас не затрымлівала? – цікаўлюся.

— Раней у Мінску, бывала, часта, а тут, як бы сказаць правільна, у нас добрыя адносіны... кліенты — людзі з сувязямі.

— Хто вашыя кліенты? Зразумела, прозвішчы пытацца не буду...

— Выязджаем на лазні і хлапечнікі, карпаратыўныя вечарыны і звычайныя п'янкі. Чым хто займаецца – казаць не буду, самі разумееце, горад малы...

— Як сталася, што Вы і вашыя сяброўкі пачалі займацца гэтым?

— У кожнай свая дарога. Кагосьці шчэ ў дзяцінстве згвалтаваў айчым — у мяне ёсць знаёмая такая, у якой маці на гэта глядзела спакойна. Так што для яе такое жыццё сталася нормаю шчэ з дзяцінства... Што тычыцца мяне, то нават і не скажу адразу... Наогул, не люблю гаварыць пра сябе...

— Кажуць, што прастытутка і наркотыкі ходзяць побач? Гэта сапраўды так?

— Так, сярод прастытутак ёсць наркаманкі, але яны выходзяць на панэль час ад часу, каб зарабіць грошай на наступную дозу.

— Што прымушае непаўналетніх дзяўчат ісці на такую працу?

— Калі вы жылі з маленства сярод бруду, п'яных сварак бацькоў, для якіх ты толькі абуза, цацкамі былі пустыя бутэлькі, а ежай рэшткі закускі? Многія не мелі ні аднаго падарунка на Новы год і Дзень нараджэння! Потым падрасталі, пачыналі хадзіць на дыскатэкі... А жыць хочацца, раскошы хочацца. Таргаваць целам? Чаму б і не, калі раней гэта рабілася за кілбаску і шклянку гарэлкі? Прыйдзіце на дыскатэку ў горад — вам у вочы адразу кінуцца вясковыя дзяўчаты.

— Вам бывае страшна ісці да кліента?

— Заўжды. Калі пачынала, не адчувала страху. Але калі выкінулі з аўтамашыны пры добрай хуткасці пад колы іншай машыны і ледзь не загінула, паклялася, што больш ніколі не буду займацца гэтым... Але час расставіў усе кропкі над «і».

На гэтым я скончыла размову. Акунуўшыся ў гэтае жыццё ўсяго на гадзіну, стала мне страшна і брыдка.

Што мы робім для таго, каб нашыя жанчыны і дзеці не гандлявалі сабой? Ці здольна грамадства абараняць тых, хто апынуўся ў бядзе? Ці можам мы спадзявацца на нашыя сацыяльныя службы і праваахоўныя органы?

...Наступным вечарам мы праехаліся па шашы з Мар'інай Горкі ў бок Дукоры. На жаль, аповед маёй суразмоўцы пацвердзіўся: шаша, кавярні, фуры, дзяўчаты. Пагутарыць з імі не ўдалося – такія яны былі п'яныя і такія агрэсіўныя хлапцы сваіх сваліся недалечы. Усяго мы паспелі налічыць 17 дзяўчат на гэтым адрэзку дарогі. Некаторым на выгляд будзе з натугай 16 гадоў. Мы з'ехалі, каб надта не прыцягваць ўвагі.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Фота зробленыя на выездзе з Мінску на Ракаўскай шашы.**

## Хай бы Лукашэнка дапамог Барадуліну

### Некалькі месяцаў таму я напісаў ліст на імя прэзідэнта.

Звярнуў увагу, што выдатны паэт Рыгор Барадулін знаходзіцца ў цяжкім фінансавым стане і мае не надта добрае здароўе. Частка грамадзян імкнецца дапамагчы паэту. Яны прадаюць яго кніжкі, каб выручыць за гэта грошы. Я прапанаваў кіраўніку дзяржавы дапамагчы Рыгору Барадуліну.

Праз паўтара месяца напісаў яшчэ адзін ліст з просьбай паведаміць мне, ці знайшлі спосаб дапамагчы паэту.

У адказ мне паведамілі, што Р.Барадуліну налічваецца пенсія за асобыя заслугі, пры разліку якой выкарыстаныя максімальныя каэфіцыенты. Ён пастаўлены на ўлік у Рэспубліканскай бальніцы Кіраўніцтва справамі прэзідэнта, дзе ў любы час можа атрымаць кваліфікаваную медыцынскую дапамогу.

«Зваротаў аб аказанні матэрыяльнай ці іншай падтрымкі ад Р.Барадуліна ў Адміністрацыю прэзідэнта не паступала, — піша начальнік галоўнага ўпраўлення па рабоце з зваротамі грамадзян Адміністрацыі прэзідэнта С.Буко. — У выпадку накіравання ім такога пісьма яно будзе разгледжана ў адпаведнасці з заканадаўствам».

**Мікола Бусел, Дуброва, Светлагорскі раён**

## Галавакружэнне ад поспехаў пры будаўніцтве аграгарадкоў

### Раней адбіралі пашпарты, каб нікуды не маглі трапіць. Цяпер іншае прыгоннае права.

Вось дзяржава непакоіцца аб падтрымцы ўласных гаспадарак. Позна! Адбілі ў чалавека ахвоту працаваць на зямлі. Калі ўласнік здасць 999 літраў малака, дзяржава даплаціць 30 тысяч рублёў. На літр выходзіць 30 рублёў — меней, чым каштуе карабок запалак. Вось гэта падтрымка.

Раней у нашым мястэчку было 110 кароваў, засталося 6. Праз 5—6 гадоў вучням першых класаў будуць паказваць кароваў у букварах.

Співаецца вёска. Дастаткова зайсці ў мясцовую краму. Віно, гарэлка, піва займае найбольшую плошчу. Чаму так адбываецца?

Па-першае, гэта форма ўласнасці. Панабудавалі аграгарадкоў. Частка не заселена. А тыя, што заселеныя, — у людзей няма радасці, безвыходнасць. Раней адбіралі пашпарты, каб нікуды не маглі трапіць. Цяпер іншае прыгоннае права. Чалавек маўчыць 10 гадоў як тое быдла, жывёла, іначай дом адбяруць. Іншы час, а метады засталіся тымі ж.

Як заўсёды ўзнікае пытанне «што рабіць?». Ды аддаваць зямлю ва ўласную гаспадарку тым людзям, хто яшчэ мае сілы, здароўе, каб змяніць пашыраную думку пра тое, што, працуючы на зямлі, не будзеш багаты, а будзеш гарбаты.

**Мікалай Рыбакоў, Копысь (Аршанскі раён)**

## Беларускія студэнты ў Польшчы ездзілі ў Мастаўляны

**2 лютага спаўняецца 171 год з дня нараджэння Кастуся Каліноўскага.** На 1 лютага прыпадае яшчэ адна дата, а менавіта пачатак нацыянальна-вызвольнага паўстання 1863 году ў Беларусі і Літве.

Грамада беларускіх студэнтаў у Польшчы з суполкі «Беларуская нацыянальная памяць» ушанавала памяць нацыянальнага героя вандроўкай у мястэчка Мастаўляны (Беласточчына), дзе ў 1838 годзе нарадзіўся Кастусь.

**Студэнт з БНП**

## Гісторык шукае....

**Гісторык Ірына Каштанян шукае для збору ўспамінаў аб беларускай штодзённасці людзей да 1930 году нараджэння, якія пражывалі ў Беларусі з 1944 па 1953 гг.**

У першую чаргу тых, хто цяпер пражывае ў г. Мінску ці наваколлі.

Для сваякоў на жаданне будзе зроблена электронная копія запісаных успамінаў.

**Калі ласка, пакідайце кантактную інфармацыю на э-адрас kashtalian@tut.by ці праз тэл. (017) 203-44-37, мабільны (029) 615-50-41 (velcom).**



ІГАР САЛАВЕЙ

**Зняў гэта ў адным старым палацыку ў самай глыбінцы нашай Бацькаўшчыны. А дзе — не прызнаюся, а то, барані божа, вар'яты дабяруцца і зрэжуць старадаўні беларускі герб.**

## Нецэнзурныя прымаўкі Лагойшчыны

У 1966 годзе этнограф Адам Варлыга (Язэп Гладкі) выдаў зборнік «Прыказкі Лагойшчыны», а ў 1972 г. — дадатак да яго. Але мала каму было ведама пра трэці, машынапісны? дадатак, таксама датаваны 1972 г., — «Прыказкі, што не трапілі ў зборнік прыказак Лагойшчыны».

Рэч у тым, што Язэп Гладкі, чалавек па характары сарамлівы, не наважыўся ў друкаваныя — «сапраўдныя» — выданні ўлучыць і брыдкаслоўі, але як навуковец і абмінуць іх цалкам не мог. Ён адбіў на машынцы дзесятак асобнікаў і раздаў іх, часта пад сакрэтам, просячы нікому не паказваць, сваім блізкім сябрам, у тым ліку і Вітаўту Тумашу, тагачаснаму дырэктару нью-йоркскага Беларускага інстытуту навукі і мастацтва. З яго збораў іх і перадрукоўвае штомесячны часопіс ARCHE. Матэрыял выйдзе ў наступным нумары.

Падпісацца на ARCHE можна на пошце. Падпісны індэкс 00345.




## Верш на прызыў Франака Вячоркі ў войска

**Мне так спадабалася позва Вячорку Ф. у ваенкамат**, дзе яго назвалі «заклічнікам», што аж захацелася першы раз у жыцці на гэтую тэму нешта зрыфмаваць.

Паколькі Франак *беларуснік*
І з мовай матчынай хаўруснік,
Стаў *выключнікам* з журфака
Гэты небарака.

У нас гэтак завядзёна:
Каб для іншых *прыцягальнікам* не стаў,
У *заклічнікі* такога маладзёна
Ваенкам наш запісаў.

Ён вывучыць на памяць
Ваенны *прысягальнік*,
Але не зможа, пэўна, уцяміць
Сэнс ягоных слоў начальнік.

Калі стане прысягаць
На незразумелай мове,
Гэта будзе азначаць:
Яго слухаць не гатовы.

Бо і для атэістаў праваслаўных,
І вернікаў, падобных Філарэту, слаўных
Гэта мова — непад'ёмны гмах.
І ім яна — не па зубах.

Павінен, будучы *ваенчыкам*,
Несці службу ён з агеньчыкам
І не сустрэцца з халадзільнікам.
Тады праз год-другі стане зноў *цывільнікам*.
А потым — можа, і студэнтам,
А потым-потым — нават прэзідэнтам.

Бо калі ім стане Коля,
Не дачакаемся ніколі.
Па той прычыне,
Што будзем ужо ў дамавіне.

**І.Ярмаліцкі, Мінск**

## Літаратурны конкурс для маладых літаратараў імя Карласа Шэрмана

### Беларускі ПЭН-цэнтр абвяшчае творчы конкурс для маладых літаратараў. Ён прымеркаваны да 75-годдзя з дня нараджэння Карласа Шэрмана.



Да ўдзелу запрашаюцца творцы ад 16 да 27 гадоў (на момант абвяшчэння конкурсу). Лаўрэаты конкурсу будуць запрошаныя на літаратурны семінар і майстар-класы ў Мінск. «На конкурс прымаюцца літаратурныя творы тых жанраў, якімі быў слаўны Карлас Шэрман, а менавіта вершы, эсэ, мастацкія пераклады, — кажа куратар конкурсу і старшыня Беларускага ПЭН-цэнтру Андрэй Хадановіч. — Таксама, у сувязі з тым, што сёлета мы адзначаем 200-гадовы юбілей Эдгара Алана По, для маладых перакладчыкаў ўведзеная спецыяльная намінацыя «пераклад аднаго твору Э.А.По».

Да разгляду будуць прымацца творы, дасланыя (паводле даты на паштовым штэмпелі або даты адпраўкі электроннага ліста) не пазней за 20 сакавіка 2009 г. Падвядзенне вынікаў першага туру адбудзецца 20 красавіка.

Калі ласка, паведамляйце сваё прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас, а таксама кантактныя тэлефоны.

Творы можна дасылаць на адрас: e-mail: pen@vessobel.by (з пазнакай «Літаратурны конкурс»). Паштовы адрас: 220050, а/с 218, Мінск, РГА «Беларускі ПЭН-цэнтр». Даведкі праз электронную пошту ці тэлефон (017) 284-73-29.

«НН» з радасцю друкуе ў газеце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаванні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы не можам пацвярджаць атрыманне Вашых лістоў, не можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Мінск.**
**e-mail: nn@nn.by. Факс: (017) 284-73-29**


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# Як стаць зоркай тэлеэкрану

Дык вы глядзіце тэлевізар? Тады, калі ласка, сустрэча для вас: Наталля Дзейка, удзельніца і фіналістка шоу на АНТ «Пасаг для нявесты». Адметнасць гэтай удзельніцы была ў тым, што разам са сваім жаніхом, Сяргеем Варывоцкім, яны адзіныя гаварылі на шоу па-беларуску. Наталля прайшла кастынг з 2500 ахвотных і дайшла да фіналу, заняўшы па выніках глядацкага галасавання 2-е месца. Пра тое, чаму беларуская мова ад пачатку была гарантыяй поспеху, пра сакрэты тэлевізійнага працэсу і натуральнасць вынікаў галасавання яна сёння расказвае чытачам «НН».

**Наталка Бабіна: Наталля, для знаёмства раскажыце спачатку трошкі пра сябе.**

**Наталля Дзейка:** Родам я са Слоніму, майго любімага гораду, даўно жыву ў Мінску. Зацікаўленне маё — гэта беларускія народныя строі. Я швачка-вышывальшчыца, умею ткаць — мяне навучыла мая бабуля, умею прасці, рабіць паясы. Я — сяброўка Студэнцкага Этнаграфічнага Таварыства. Мая мара — зрабіць традыцыйнае адзенне сучасным, паўсядзённым, і пакуль я рыхтуюся да таго, каб займацца гэтым больш прафесійна.

**НБ: А як Вы трапілі на шоу «Пасаг для нявесты»?**

**НД:** Мой жаніх паслаў туды маю анкету. Для гэтай праграмы патрэбна было, каб пара была рэальнай і планавала хутка пажаніцца. Да слова, некаторыя дзяўчаты-ўдзельніцы ўжо сыгралі свае вяселлі... Дык вось, мая анкета адзіная была па-беларуску. На кастынгу, калі я стала размаўляць з журы, мяне разы са тры запыталі: а вы будзеце размаўляць на роднай мове? А ваш жаніх таксама? І з нейкіх поглядаў сяброў журы я зразумела, што, мусіць, траплю ў лік удзельніц...

**НБ: І як развіваліся падзеі далей?**

**НД:** Я сапраўды трапіла ў лік удзельніц разам яшчэ з пяццю дзяўчатамі. Потым быў забег пяцідзесяці нявест па набярэжнай Свіслачы, пераможца якога стала сёмай удзельніцай, — і пачаліся конкурсы, у якіх трэба было перамагаць. Мы танцавалі, здымаліся ў кіно, нашы жаніхі адказвалі на пытанні пра нас, а потым быў забег у гіпермаркеце... Усё было ў запісе — бо, як я зразумела, без запісу гэта было б папросту немагчыма зняць.

**НБ: Якое ў Вас уражанне засталося ад тэлебачання, ад тэлевізійных людзей?**

**НД:** Было цікава. Не скажу, што там усе цікавыя, ёсць людзі зусім нецікавыя, але назіраць за працэсам здымак і ўдзельнічаць у іх было захапляльна. Тэлебачанне — гэта вар'яцкая прафесія. Там трэба мець стальныя нервы і быць страшным аматарам сваёй прафесіі. Вядоўцы, Хрусталёў і Агурбаш, умелі трымаць годнасць і, калі трэба было, выратоўвалі сітуацыю. Дарэчы, Хрусталёў і быў аўтарам гэтага шоу... Калі ішоў запіс, гэта былі «дзікія» гадзіны... То тое аказвалася не так, то гэта... Не, працаваць на тэлебачанні могуць толькі вельмі захопленыя людзі...

**НБ: Наталля, у конкурсе танцаў Вы танцавалі сярэднявечны танец, а іншая ўдзельніца — стрыптыз з шастом. Вам нехта прапаноўваў, што менавіта рабіць, раіў нешта?**

**НД:** Нам прадыктавалі, якія ёсць варыянты, і дзяўчаты выбіралі, што ім бліжэй. Мне здаецца, што мне мой танец вельмі пасаваў... Як і вобраз Тоні Кісліцынай мне пасаваў.

**НБ: А Вас не бянтэжыла тое, што Вы ўдзельнічаеце ў спаборніцтвах, ды яшчэ разам з іншымі дзяўчатамі? У валасы адна адной ніколі не ўчапляліся?**

**НД:** Так, жорсткім выпрабаваннем было тое, што дзяўчаты павінны былі самі «адбракоўваць» удзельніц. Але гэта і было якраз тое, чаго хацелі аўтары і арганізатары шоу, тыя эмоцыі і той канфлікт, якія павінны былі прыцягнуць гледачоў... Было, што дзяўчаты сварыліся, калі журы давала некаму высокі бал, а нам падавалася, што гэта не зусім справядліва... Напрыклад, у кінаконкурсе Ірыне — вельмі цікавай дзяўчыне, лідэру па натуры — далі высокі бал за ролю Надзі ў рэмэйку «З лёгкім парам», у той час як яе роля не была яркай. Іншыя дзяўчаты былі пакрыўджаныя, бо іх ролі былі цяжэйшымі. І вось тут быў такі момант, калі адбыліся нейкія сваркі... Гэта ў тэлепаказ не трапіла... Наступным днём быў конкурс жаніхоў, і вось па выніках гэтага конкурсу кандыдатамі на вылет аказаліся я і Ірына... Калі мы з ёй стаялі побач, і дзяўчаты пазіралі на яе неўхвальна, а яна на іх, то... Вось тут і быў той шквал эмоцый, якога так прагнулі аўтары... А ўвогуле, я чамусьці была ўпэўнена, што я «вылечу» ў першую чаргу. Я думала, што дзяўчаты будуць так меркаваць: ну, што гэта за істота, размаўляе па-беларуску? І вось, калі ў мой адрас было сказана столькі добрых слоўаў і я дайшла да фіналу — я была прыемна ўражана.

**НБ: А Вы і ў жыцці размаўляеце па-беларуску, ці гэта быў такі піяр-ход на шоу?**

**НД:** Я не размаўляю па-беларуску ў крамах, таму што не хачу любавацца на здзіўленыя твары прадавачак, я не размаўляю па-беларуску з дактарамі, бо, баюся, яны мяне не зразумеюць, я не размаўляю па-беларуску са старымі сябрамі, з якімі ад пачатку кантактавалі па-расійску. Але ў мяне ёсць кола — найперш гэта сям'я, мой жаніх і шмат сяброў — з якімі мы гаворым па-беларуску. Мой жаніх — доктар, цяпер ён працуе яшчэ і выкладчыкам і выкладае па-беларуску.

**НБ: Пераможцу шоу «Пасаг для нявесты» вызначалі гледачы галасаваннем. Як Вам падаецца, гэтае галасавне было сапраўдным, справядлівым? Людзі сапраўды так прагаласавалі, ці гэта быў таксама элемент шоу, і там усё было перадвызначана?**

**НД:** Я тут нічога не магу сказаць, бо я гэтага не ведаю. Я думаю, што гэта зусім натуральна, зусім нармальна, алімпійскаму чэмпіёну «падарыць» такую нявесту з пасагам.

**НБ: Якому алімпійскаму чэмпіёну?**

**НД:** Жаніх Леры, якая перамагла — алімпійскі чэмпіён, Аляксандр Багдановіч, які разам з братам атрымаў залаты медаль у веславанні... Чалавек такі падарунак зрабіў свайму народу (можа, і не апошні), і АНТ таксама зрабіў яму падарунак — пасаг для нявесты. Гэта зусім нармальна.

**НБ: А Вы атрымалі нейкі ганарар за ўдзел?**

**НД:** Не, я, як і іншыя удзельніцы, атрымала падарункі за тыя конкурсы, у якіх перамагла. Я перамагла ў конкурсе танцаў і кінаконкурсе і атрымала за гэта музычны цэнтр і кава-машыну. І вельмі задаволена, бо, канечне, сама гэтых рэчаў я ніколі не стала б набываць *(смяецца)*.

**НБ: Ну, і якую выснову Вы зрабілі для сябе пасля досведу ўдзелу ў перадачы?**

**НД:** Цяпер такія думкі ў галаве: можа, падацца на тэлебачанне? Усё ж гэтая праца зацягвае. Ну, і скажу, што ў сваіх вачах, у вачах жаніха, бацькоў я вырасла *(смяецца)*. Гэта было выпрабаванне ў чымсьці, гэта было цяжка, але мне спадабалася. Гэта будзе ўспамінацца: дзікі страх перад выхадам на сцэну, і словы падтрымкі ад незнаёмых людзей, і шампанскае — найлепшы рэдактар, які дапамагаў пераадолець хваляванне.

**Гутарыла Наталка Бабіна**

# Ці хадзіў па Беларусі «Чорны кот»?

Чалавечая памяць трансфармуецца і схільная змяняць уяўную рэчаіснасць. Пра падзеі 60-гадовай даўніны нашыя ўяўленні могуць быць менш поўныя, чым пра XVI ст. Вандруючы па Заходняй Беларусі, вы можаце бачыць, напрыклад, у парку за Мірскім замкам, магілы савецкіх функцыянераў, забітых у пасляваенны перыяд. А ў Паставах і Мёрах яшчэ жывуць удзельнікі антысавецкіх арганізацый моладзі, якія напоўніцу спазналі законы выжывання ў сталінскіх лагерах. Маючы вакол сябе такія матэрыяльныя сведчанні, мы, тым не менш, не маем у сваіх галовах цэльнай карціны пасляваенных падзей — уяўленя пра іх маштабы, пра мірны і нямірны характар супраціву, пра дзейнасць савецкіх спецслужбаў...

Тут, вядома, найважнейшая роля належыць гісторыкам — ад таго, якія тэмы, персаналіі, сюжэты яны гатовыя выцягваць з забыцця. Закон рамяства гісторыка патрабуе ад даследчыка абапірацца на архіўныя крыніцы — для беларускай гісторыі гэта актуальна адносна XV—XX стст. Але для вывучэння антысавецкага супраціву 1945—1953 гадоў архівы — сапраўды праблема. Як вы разумееце, яны спецыялізаваныя, у нашым выпадку — належаць КДБ.

Што ж рабіць даследчыкам, для якіх творчая свабода ёсць прынцыпам? Застаюцца вельмі цікавыя і эфектыўныя прылады — вусная гісторыя, успаміны... Гэта эмацыйна, а часам і інфармацыйна вельмі багатыя крыніцы. Вось толькі чалавечая памяць схільная змяняць рэчаіснасць. Як іх пераправерыць?

Дзейнасць партызанскіх аддзелаў Яна Раманчука (раён Нясвіжу, Стоўбцаў, Баранавічаў), Аўгена Жыхара (Глыбоччына і Пастаўшчына), Сяргея Мікуліча (у раёне Іллі), мірных групаў антысавецкае моладзі Расціслава Лапіцкага (Мядзель—Смаргонь), «Саюзу Беларускіх Патрыётаў» (Глыбокае—Паставы), падпольнай сеткі «Чайка» (Слонім—Баранавічы—Пінск) ды многіх іншых не выклікае сумневаў — пра гэта сведчаць судовыя справы і самі ўдзельнікі супраціву. Паводле ацэнак гісторыкаў, арганізацый такога кшталту існавала некалькі дзесяткаў.

А вось наконт таго, ці існавала сетка «Чорнага ката», ці, інакш, арганізацыя генерала Вітушкі, працягваюцца дыскусіі. Папулярызатарам яе дзейнасці з'яўляецца найперш Сяргей Ёрш, які калісьці пісаў пра яе і ў «НН». Калі верыць яму, арганізацыя «Чорны кот» найбольш актыўна дзейнічала ў 1948—1950-х гадах ды складалася з рэгулярных партызанскіх аддзелаў ды ўдзельнікаў збройнага падполля, якія легальна працавалі ў калгасах і на прадпрыемствах. С.Ёрш называе дзесяткі акцыяў на чыгунцы, напады на савецкія склады і гарнізоны, на вёскі і мястэчкі, тэракты супраць прадстаўнікоў савецкае ўлады... Асноўныя ягоныя крыніцы — звесткі эміграцыйных выданняў і ўскосныя сведчанні людзей тае эпохі.

Польскі даследчык Рафал Унук, насцярожаны адсутнасцю перакана́ўчых фактаў і ўзброены веданнем прынцыпаў працы савецкіх спецслужбаў, перакапаў публікацыі на гэтую тэму і прапаноўвае сваю версію падзеяў, поўную скепсісу. Аргументы Рафала Унука не выпадае адкінуць.

**Алег Дзярновіч**

## Легенда пра падполле Вітушкі — аперацыйная гульня савецкіх спецслужбаў

**Такога меркавання трымаецца польскі гісторык Рафал Унук, які апублікаваў сваю грунтоўную працу пра беларускае антысавецкае супраціўленне ў часопісе ARCHE (№ 7—8 за 2008). Прапануем Вам яе кароткі пераказ.**

У Польшчы, Эстоніі, Літве, Латвіі і Украіне за апошнія гады ўзнікла багата прац на тэму пасляваеннага антыкамуністычнага супраціву. На гэтым фоне Беларусь заставалася асаблівай тэрыторыяй. Быў апублікаваны шэраг тэкстаў, прысвечаных польскаму, украінскаму і літоўскаму падполлю на тэрыторыі БССР, затое беларускае антыкамуністычнае нацыянальнае падполле заставалася недаследаваным. Таму што гэтая тэма была нявыгадная прасавецкім уладам.

Але падобныя працы беларускіх гісторыкаў пачалі з'яўляцца. Паводле аўтараў кнігі «Беларускі супраціў» С. Ярша і С. Горбіка (Львоў, 2006), напрыклад, у разгалінаванай сетцы «Чорнага ката», або, іншая назва, «Беларускае вызвольнае войска», у 1945—1950 гадах дзейнічалі 3000—3500 чалавек, а да шырокага арганізацыйнага тылу належала 20—30 тыс. чалавек.

Адразу скажу, што аспрэчанне аўтараў «Беларускага супраціву» не раўназначнае сцверджанню, што беларускія нацыянальныя дзеячы, якія жылі пад савецкай акупацыяй, не рабілі спробаў супраціву. Аднак пры абмежаваным доступе да актаў НКВД мы часта натыкаемся на інтэрпрэтацыйныя праблемы, а з неадназначных запісаў цяжка зрабіць высновы пра нацыянальны ці арганізацыйны характар групы. Няма праблемы, калі ў апісанні сустракаецца акрэсленне «літоўская банда» ці «белапольская банда». Аднак часта ў тэксце дакументу няма ніякай згадкі, якая б дазваляла вызначыць нацыянальны характар партызанскай групы. У той жа час у даступных савецкіх архівах няма ніякіх сведчанняў пра дзейнасць разгалінаванай сеткі «Чорнага ката» ці генерала Вітушкі, пра якіх пішуць аўтары кнігі «Беларускі супраціў».

С.Ёрш і С.Горбік грунтуюць сваю версію падзей на артыкулах, публікаваных у беларускіх эміграцыйных выданнях і на ўспамінах удзельнікаў падзеяў. Невыкарыстанне архіўных дакументаў яны апраўдваюць поўнай адсутнасцю доступу да іх даследчыкаў, не звязаных з лукашэнкаўскім апаратам улады.

Як выглядаюць сцверджанні С. Ярша і С. Горбіка ў святле даследаванняў, якія праводзяцца ў іншых краінах, дзе архівы бяспекі тых гадоў адкрыліся?

Насуперак сцверджанням гэтых беларускіх аўтараў літоўскія гісторыкі не знайшлі ніякіх звестак пра беларускі аддзел «Вітаўта», які быццам бы дзейнічаў на тэрыторыі ЛітССР, ім таксама невядома пра разгон партызанамі ў Вільні нейкага партыйнага мітынгу 8 верасня 1951 г.

Даследчыкі, якія займаюцца гісторыяй ОУН-УПА, не натрапілі ні на якія сведчанні супрацы ўкраінскага нацыяналістычнага падполля з маёрам Вітушкам ці сеткай «Чорны кот», а ўкраінскі ўдзел у так званай атацы на Навагрудак, пра які пішуць Ёрш і Горбік, трэба прызнаць чыстай фікцыяй.

Вынікі даследаванняў антыкамуністычнага падполля на тэрыторыі цяперашняй Польшчы ставяць пад сумнеў усе сцверджанні гэтых аўтараў. Ніводная польская падпольная сетка на Беласточчыне ці ў іншым месцы Польшчы не мела кантактаў з беларускім падполлем.

Інфармацыя аб дапамозе польскіх сетак у перакіданні беларускіх партызанаў на Захад у 1949 г. — гэта чарговая байка. Пасля 1947 г. не існавала ніводнай польскай падпольнай арганізацыі, якая б мела шляхі перакідання на Захад. Дастаткова агульных ведаў, каб казаць, што нелегальны пераход польска-савецкай, польска-нямецкай і нямецка-нямецкай мяжы ў 1946—1956 гадах быў надзвычай цяжкім, амаль невыканальным заданнем. Тым больш у прафесійнага гісторыка павінна выклікаць сумненні лёгкасць, з якой чальцы сеткі «Чорны кот», паводле Ярша і Горбіка, шмат разоў пераходзяць гэтыя межы.

**Сувязь з беларускім антысавецкім падполлем была даручана брытанскаму афіцэру і адначасова савецкаму агенту Кіму Філбі.**

Адкуль Ёрш, Горбік, а таксама роднасныя ім аўтары чэрпаюць свае адкрыцці? Несумненна, іх бачанне беларускага антыкамуністычнага падполля адлюстроўвае перакананні, якія панавалі ў асяроддзі пасляваенных лідэраў беларускай эміграцыі. Як піша спецыяліст з гісторыі Беларусі Нікалас Вакар, старшыня БЦР на эміграцыі Р. Астроўскі ў канцы 1940-х гадоў дабіваўся, каб брытанская разведка падтрымлівала беларускі партызанскі рух, цвердзячы, што ён налічвае 50 тыс. чалавек і змагаецца пад камандаваннем легендарнага камандзіра ген. Міхала Вітушкі.

А прэзідэнт БНР на выгнанні Мікола Абрамчык публічна дэманстраваў медалі няіснага беларускага партызанскага войска. Варта згадзіцца з заўвагай Вакара, паводле якой гэтыя дзеячы «жылі ў поўным адрыве ад рэчаіснасці» і праяўлялі «нязвыклую здольнасць верыць ва ўсё, у што хацелі паверыць».



**Міхал Вітушка** нарадзіўся 5 лістапада 1907 у Нясвіжы. У часы нямецкай акупацыі стварыў беларускую паліцыю ў Мінску, а таксама цывільную адміністрацыю ў Бранску. З лета 1944 — афіцэр вывучанага немцамі дэсантнага батальёну «Дальвіц», маёр Беларускай Краёвай Абароны. У лістападзе 1944 група на чале з Вітушкам была закінутая немцамі на тэрыторыю Беларусі. Паводле версіі беларускага КДБ, Вітушка і яшчэ 4 дыверсанты ў снежні 1944 былі затрыманыя групай акаўцаў і пасля перамоваў з кіраўніцтвам Віленскай акругі АК увайшлі ў склад польскай партызанкі. Падчас бою акаўцаў з савецкімі аддзеламі 7 студзеня 1945 Вітушка быў забіты. Беларускі даследчык Сяргей Ёрш прытрымліваецца версіі, хоць і ўказвае на яе няспраўджанасць, што Вітушка памёр 27 красавіка 2006 у Заходняй Германіі.

Ведаючы тагачасныя рэаліі, можна сур'ёзна задумацца, ці не была версія пра вялікае падполле Вітушкі элементам аперацыйнай гульні савецкіх спэцслужбаў, нацэленай у гэтым выпадку ў асяроддзе беларускай эміграцыі і заходнія разведвальныя службы? Нам шмат вядома аб правядзенні такіх аперацый у Польшчы, СССР і балтыйскіх рэспубліках, таму нельга выключыць, што савецкія чэкісты для аперацыйных патрэб стварылі фікцыйную беларускую сетку Вітушкі. Гэта было трэба, каб дэзарыентаваць колы беларускіх эмігрантаў і Захад.

Гэта часткова мела поспех. Сур'ёзныя сумненні наконт існавання агульнабеларускага руху супраціву не перашкаджалі заходнім разведвальным службам спрабаваць пабудаваць падполле на тэрыторыі БССР. Нагляд за гэтай аперацыяй MI6 даручыла брытанскаму афіцэру і адначасова савецкаму агенту Кіму Філбі (Kim Philby). Існуюць таксама звесткі, якія сведчаць пра тое, што ў непасрэдным акружэнні Міколы Абрамчыка круціліся некалькі савецкіх шпіёнаў. Не выключана, што менавіта таму дэсант Вострыкава ў Налібоцкай пушчы чакалі загадзя.

Падобна як эміграцыйныя палітыкі на мяжы 1940—1950-х гадоў, Сяргей Ёрш і Сяргей Горбік, насуперак фактам, хочуць верыць, што існавала вялікая падпольная антыкамуністычная армія Вітушкі.

**Ад Рэдакцыі.** Мы звязаліся з С.Яршом з просьбай пра каментар. Ён адмовіў.

У Беларусі было нямала герояў, вартых захаплення. Аднак трэба адрозніваць сапраўдных герояў, якія ахвяравалі сабой дзеля заваявання беларускай нацыяй незалежнасці, ад псеўдагерояў ці, прынамсі, слабавольных ахвяраў драматычнага часу, калі беларусы апынуліся між молатам нялюдскага нацызму і кавадлам забойчага сталінізму. Здаецца, да ліку такіх належыць і няспраўджаны «генерал Вітушка».

Нельга не пагадзіцца з Рафалам Унукам у тым, што, «каб такі міф [пра нацыянальных герояў] ... паспяхова адыгрываў ролю аб'яднаўчага фактару, ён павінен грунтавацца на фактах. Калі так не адбываецца, тады зробленая раней ці пазней крытычнымі гісторыкамі дэканструкцыя міфу выкліча рэзкі падзел, а можа прывесці і да распаду ранейшага бачання ўласнай мінуўшчыны».

«НН» пісала і будзе пісаць пра герояў беларускае гісторыі, у тым ліку і тых, што пралілі кроў на алтар нацыянальнага вызвалення, змагаючыся супраць саветаў.

# Расчараваны Армагедонам

**Зборнік апавяданняў беларуска-ізраільскага аўтара Паўла Касцюкевіча добра браць з сабою ў камандзіроўку дзеля невялікіх памераў, выразнага друку і кароткіх апавяданняў, якія запрашаюць стомленыя аднастайнасцю дарогі думкі ў часы, калі трава была зелянейшаю, сонца — ярчэйшым, а дрэвы — вышэйшымі. Піша Даніла Жукоўскі.**

## Ідыятызм Сусвету

У фокусе аўтарскай увагі — спецыфічна юнацкае адкрыццё дарослага свету.

І гэта і ёсць той чароўны дарослы свет, у які я імкнуўся?

Гэта і ёсць дарослы свет, дзе старая Цыпі са старым Хаімам з нечуваным апломбам вярзуць недарэчнасці пра вялікі свет («Мапа»)? Гэта і ёсць дарослы свет, у якім забава мусова саступае месца нуднай працы і не менш нуднаму побыту?

Гэткія пытанні ў той ці іншай форме паўстаюць перад кожным маладым чалавекам разам з не менш непазбежнымі пытаннямі пра сутнасць смерці, кахання, сяброўства і ўвогуле пра сэнс жыцця. У адрозненне ад Адольфа (цьфу! — Альгерда) Бахарэвіча, сп.Касцюкевіч імкнецца паставіцца да акаляючага нас паскудства штодзённасці без усёпаглынальнае нянавісці.




**Павал Касцюкевіч. Душпастарскія спатканні для дачнікаў.** — Вільня: Інстытут беларусістыкі, 2008 — 168 ст. — (Кнігарня «Наша Ніва»)

Гэта няпроста, вельмі няпроста і мо таму выклікае ў аўтара «Спатканняў...» вострую і, відаць, абгрунтаваную патрэбамі не толькі мастацкімі, але і псіхалагічнымі, цягу да фармальна-абсурдысцкага пісьма. У бок аголенага абсурду штурхаюць цікаўнага маладзёна разнастайныя, на першы погляд, але ўсе як адзін абыякавыя да тваіх пакутаў ідэалогіі, якія ў розныя часы розныя дурні паабзывалі вялікімі (за што ўрэшце шмат хто з дурняў атрымаў кулю ў патыліцу і да т.п.). Ну як не закрычаць: «Не хачу!» Але ж ніхто не пытаецца, хочаш ці не хочаш (гл. хаця б «Паўночнае сонца праспекту»).

Да тыповых падлеткава-юнацкіх «трагедыяў» у сп.Касцюкевіча далучаюцца спецыфічна яўрэйскія. Зямля продкаў, Зямля Абяцаная, выяўляецца на дарослым узроўні рэальнасці краінаю памерам «з камарыны задок» (выраз, пачуты ад аўтара), куды не хоча ехаць «Дэпеш Мод», і да таго ж смяротна пасваранаю з найбліжэйшымі суседзямі. Высокая місія жыцця на Зямлі Абяцанай у брутальнай рэчаіснасці абмяжоўваецца ўдзелам у бясконцай вайне з вельмі цьмянымі перспектывамі на перамогу. Высакародная справа аліі і парыванне з несвабоды ў свабодны свет заканчваецца праблемамі выжывання ў вельмі адрозным ад прывычнага з дзяцінства грамадстве (гл. хаця б «Сэрца танка»), якое нібыта абраў сам, але якому да тваіх праблем — а гэта для маладзёна заўсёды адкрыццё — няма аніякае справы. Ну ізноў жа, як тут не закрычаць: «Не хачу!»


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

І што гэта ўвогуле за свет такі, дзе нават Армагедон ёсць усяго толькі «грудок з камяністым плато, не дужа высокі такі пагорак, метраў шэсцьдзесят увышкі»?

Не кожны ў гэткай сітуацыі адкажа смехам. Ды і хто асудзіць чалавека, які прыгадае тут колішняе, чытанае ў далёкай савецкай школе, «как не впасть в отчаяние при виде того, что совершается дома»? І як няпроста аўтару вызначыцца, дзе ж той сапраўдны дом, на ролю якога прэтэндуе, страшна нават згадаць, увесь гэты свет, у якім нават для Армагедону не знайшлося вартага месца.

## Жыць у правінцыі

Натуральна, поруч з перакананнем у дасканаласці Сусвету ідзе пачуццё ўласнае значнасці. Пасля ўсведамлення недасканаласці першага наступным шокам ёсць здагадка, што недасканаласць распаўсюджваецца і на таго, каго мы прывыклі называць «Я».

Ізноў жа, сп.Касцюкевіч не даходзіць тут да крайнасцяў Бахарэвіча, змагаючыся за здаровы розум і сілкуючыся самаіроніяй. Яго героі зазнаюць падваенне асобы і іншыя метамарфозы, але ланцужковая рэакцыя расчаравання не пераходзіць у антонаў агонь нянавісці. Спускаючыся з падлеткава-юнацкіх эмпірэяў на грэшную зямлю, развейваючы ідэальныя рысы ўласнага вобразу ва ўласнай жа свядомасці, Касцюкевіч прыходзіць да таго, каб кінуць першыя цвярозыя погляды на тую мізэрную правінцыю цудоўнага ідэальнага Сусвету, у якой, насуперак жаданням і мроям, давядзецца жыць.

На месца, дзе найбольшым уласным геаграфічным адкрыццём будзе факт, што Касцюковічы (яшчэ адзін удар па самалюбстве!) істотна меншыя за Мінск. На месца, дзе адзіным годным спосабам узняцца да непаўторнасці будзе пераадоленне спакусы даць выспятка выпадкова сустрэтаму пасярод Ірушалайму Жан-Клоду Ван Даму. Бо ў гэтым свеце тых, хто даў бы выспятка, калі б мог, істотна болей, чым тых, хто, калі б мог даць, устрымаўся: логіка Кручкова з «Пінскае шляхты» ў гэтым свеце больш на месцы, чым дагматы Апакаліпсісу або ідэі Чучхе.

Маладосць — якраз той недахоп, які, як добра вядома, выпраўляецца сам сабою і да таго ж надзвычай хутка. Таму клапаціцца пра недахопы, выкліканыя менавіта маладосцю аўтара, падаецца малаважным. Тым больш, пашпартны ўзрост маладога пісьменніка ўсё больш разыходзіцца з літаратурна ўвасобленым, і гэта ставіць пытанне пра новы пласт фактаў і новы ўзровень асэнсавання і адлюстравання.

Як кожнаму, аўтару «Спатканняў...» трэба жыць, трэба шукаць сваё «шчасце быць». Або проста сваё пісьменніцкае шчасце ў гэтым асобна ўзятым варыянце рэчаіснасці, ахоўваючы дасканаласць уласнага даробку ў недасканалым свеце. Калісьці невядомы кравец тлумачыў невядомаму замоўніку, чаму, калі Бог стварыў свет за шэсць дзён, ён шые гарнітур цэлы месяц: «Дык зірні, пане, на гэты свет і на гэты гарнітур!»

Непаўторны момант жыцця (уласнага і свету) адлюстраваны, але блізіцца момант, калі падлеткавы максімалізм і мегаламанію мусіць заступіць жыццёвым досведам, экзотыку — культураю, выкрывальніцкі, шматвектарны вожык негатывізму — сціплейшай, але пазітыўнай праграмай. Выпраўляць надрукаванае, тым болей, як гэта ўласціва серыі «Кнігарня «Наша Ніва», надрукаванае ўжо неаднойчы, падаецца бессэнсоўным. Хочацца спадзявацца, што вычарпальна скарыстаўшы ўдзячную тэму сталення, аўтар адчуў патрэбу ісці далей: з тым жа аптымізмам і здаровым сэнсам, узбагачаны новым разнастайным досведам, часткаю якога сталася і разгляданая тут кніжка. Прынамсі пра сябе як пра аўтара кнігі ён, здаецца, яшчэ няшмат пісаў.

## КАЛЯНДАР

### Люты

**2** — Каталіцкія Грамніцы. Грамніцы – зімы палавіцы.

**4** — Міжнародны дзень абароны ад раку.

**9** — Новы год дрэваў у юдэяў.

**12** — 200 гадоў таму (1809 г.) нарадзіўся Чарльз Дарвін, стваральнік тэорыі эвалюцыі.

**14** — Дзень святога Валянціна (Свята усіх закаханых).

**15** — Праваслаўныя Грамніцы (Стрэчанне Гасподняе). У цэрквах свецяць свечкі.

**21** — Міжнародны дзень роднай мовы.

**25** — 50 гадоў таму (1959 г.) памёр Клаўдзі Дуж-Душэўскі, палітык, грамадскі дзеяч, педагог, стваральнік эскізу беларускага нацыянальнага сцягу.

**25** — Папялец — першы дзень Вялікага посту ў каталікоў, які пачынаецца за 46 дзён да Вялікадня.

**Уклаў ЛК**


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## Аднакласнікі зноў выдалі Леаніда Маракова

Пакуль у адной з друкарняў Мінску набіраецца манументальная 800-старонкавая праца вядомага беларускага пісьменніка і гісторыка Л. Маракова «Рэпрэсаваныя каталіцкія духоўныя, кансекраваныя і свецкія асобы Беларусі. 1917—1964», аднакласнікі пісьменніка выдалі чарговы цыкл аповедаў таварыша: «Яны не ведалі» і «Сшытак забітага кантрабандыста».

Гэта 50 вострасюжэтных з элементамі дэтэктыву, крыміналу, фантастыкі, містыкі і меладрамы шот-сторы. Чытаюцца яны на адным дыханні.

Фіналы, як і ў папярэдняй кнізе аповедаў Леаніда, выдадзенай аднакласнікамі, — «Непамяркоўныя», чыста «маракоўскія»: непрадказальныя, якія пераварочваюць увесь сюжэт на 180 градусаў.

Героі твораў пісьменніка змагаюцца ў абсалютна няроўных умовах, кідаюцца ў бітву, нават калі шанец выйграць адзін з тысячы. Яны ўпэўненыя: лепш смерць у баі, чым рабскае існаванне... Падрабязнасці на сайце пісьменніка.

**ЛК; паводле gazetaby.com**

## НОВЫЯ КНІГІ ПА ГІСТОРЫІ

**Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т. 2: Беларусь у перыяд Вялікага Княства Літоўскага** / Навук. рэд. Г.Галенчанка, Ю.Бохан. — Мінск: Экаперспектыва, 2008. — 688 с.; іл.

Гэта працяг маштабнага праекту. Выданне робіцца акадэмічнымі гісторыкамі, але не мае афіцыйнага грыфу. Так атрымалася, што раней з’явіўся т. 5, а том па Сярэднявеччы выйшаў толькі цяпер. Адметнасць тому — грунтоўная рэпрэзентацыя царкоўнай гісторыі.

**Мінск і мінчане: дзесяць стагоддзяў гісторыі (да 940-годдзя гораду)**: матэрыялы міжнароднай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі (Мінск, 7—9 верасня 2007 г.). — Мінск: Беларуская навука, 2008. — 400 с.

Зборнік матэрыялаў афіцыйнай канферэнцыі, якая адбылася ў Мінскай ратушы. У рэзалюцыі было зазначана: «Прапанаваць Мінскаму гарадскому выканаўчаму камітэту прымаць рашэнні па рэстаўрацыі, рэканструкцыі, аднаўленні помнікаў гісторыі і архітэктуры Мінску... на аснове навуковых заключэнняў спецыялістаў...»

**АДз**



PHOTO.BY.MEDIA.NET

## КАНЦЭРТЫ

**Гаротніца**

**6 лютага ў фальварку «Добрыя Мыслі» (Магілёўская, 12) а 21-й** пачнецца канцэрт праекту Андрэя Такінданга «Гаротніца» (дэструктыўны пажарны аркестр з жаночым вакалам, элементамі ска, класікі, джазу, і ярка акрэсленай маргінальнай творчай пазіцыяй). Квіткі: 10—12 тыс. рублёў.

**Стары Ольса**

**14 лютага ў Вялікай залі к/з «Мінск» а 19-й** пачнецца прэзентацыя альбому «Старога Ольсы» — «Дрыгула», выдадзенага паводле матываў «Полацкага сшытку».

**Крама**

**11 лютага а 20-й у Rock House Cafe (Няміга, 12)** — сольны канцэрт гурту «Крама».

## ІМПРЭЗЫ

**Дабравесце ад Уладзіміра**

**У зале Тэатру расійскага рамансу (Чыгуначная, д.27, к.2) 5 лютага** адбудзецца монаспектакль «Дабравесце ад Уладзіміра» паводле твораў Уладзіміра Караткевіча ў выкананні Валерыя Шушкевіча. Квіткі: 10 тыс. рублёў.

**Творчая вечарына Леаніда Лыча**

**8 лютага ў Дольнай залі касцёлу Св. Сымона і Алены** ладзіцца творчая вечарына Леаніда Лыча з нагоды яго 80-годдзя. **Пачатак а 18-й.** Леанід Лыч — доктар гістарычных навук, прафесар, аўтар больш чым 500 навуковых прац (у тым ліку — 15 кніг) па праблемах беларускага нацыянальнага развіцця і дзяржаўнага будаўніцтва.

**Канферэнцыя ў гонар Эдварда Вайніловіча**

**14 лютага а 9-й у Дольнай частцы касцёлу Св. Сымона і Алены** пачнецца беларуска-польская навуковая кафе-



рэнцыя «Эдвард Вайніловіч — зямянін, грамадзянін, каталік».

**Лекцыя Станіслава Судніка**

**11 лютага ў музеі вёскі Радунь Воранаўскага раёну** адбудзецца лекцыя краязнаўцы, рэдактара газеты «Наша слова» Станіслава Судніка на тэму «Праблемы краязнаўства ў Воранаўскім раёне». **Пачатак а 16-й.**

## ВЫСТАВЫ

**Ван Дэйк і яго эпоха**

**У Гродзенскім гісторыка-археалагічным музеі (Новы замак) да 28 лютага** працуе выстава «Ван Дэйк і яго эпоха».

**Чатырнаццаць гісторыяў**

**У фотагалерэі «ZНЯТА» (пр.Незалежнасці, 13) да 20 лютага** працуе фотавыстава ландшафтнага партрэту «ЧаТЫРНАЦЦАЦЬ ГІСТОРЫЯЎ».

**Арт-крок-2009**

**У галерэях Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі да 15 лютага** працуе выстава «Арт-крок». Паводле ўмоваў праекту, мастак падае на свой выбар любыя творы, створаныя ім за апошні год і якія не выстаўляліся раней.

**Драйв — 2008**

**У Музеі беларускай літаратуры (Багдановіча, 13) да 25 лютага** працуе выстава лічбавай фатаграфіі «Драйв — 2008».

**Са-тварэнне**

**У галерэі NOVA (Харужай, 16) да 22 лютага** працуе выстава фотамастака Данілы Парнюка «Са-тварэнне. Хроніка сямейнага жыцця».

**Экашык**

**У Музеі гісторыі і культуры Беларусі** працуе выстава экалагічнай шведскай моды «Экашык» — для ўсіх, каго цікавяць пытанні ўстойлівага развіцця, аховы навакольнага асяроддзя і мода, а таксама іх узаемадзеянне.

У рамках выставы пройдзе майстар-клас па стварэнні экалагічнай вопраткі.

## ТЭАТРЫ

**Купалаўскі тэатар**

**5 (чц)** — «Сымон-музыка»
**6 (пт), 7 (сб)** — «Ядвіга»
**8 (ндз)** — «Макбет»
**9 (пн)** — «КІМ»
*ранішнія спектаклі*
**8 (ндз)** — «Прыгоды Заранкі і Янкі»
*малая сцэна*
**9 (пн)** — «Адчыніце кантралёру!»
*балет*
**5 (чц)** — «Бахчысарайскі фантан»
**8 (ндз)** — «Карміна Бурана», «Кармэн-сюіта»
**11 (ср)** — «Лебядзінае возера»
**12 (чц)** — «Рамэа і Джульета»
**15 (ндз)** — «Беласнежка і сем гномаў»

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Дарога зменаў




**Дарога зменаў**

ЗША — Вялікабрытанія, 2008, каляровы, 119 хв.

**Рэжысёр:** Сэм Мэндэз

**Ролі выконваюць:** Кейт Уінслет, Леанарда ДыКапрыё, Дэйвід Гарбар, Кэці Бэйтс, Рычард Істан

**Жанр:** Псіхалагічная драма

**Узнагароды:** «Залаты глобус» за найлепшы фільм і найлепшую жаночую ролю

**Адзнака:** 7 (з 10)

Эйпрыл і Фрэнк Уілер жывуць у нявялічкім амерыканскім прыгарадзе. Але шэрая рэчаіснасць зацягвае — і Эйпрыл марыць сям'ёй з'ехаць у Парыж, каб пачаць новае і нянуднае жыццё. Ці вытрымае сям'я дзіўныя мары?

Карціна разыграная з найдакладнейшым акторскім майстэрствам — камерная псіхалагічная драма, багатая глыбокімі падтэкстамі. Нехта ўбачыць у карціне трагедыю эмансіпацыі, калі жанчына 1950-х, затурканая хатняй працай, паспрабавала «вырвацца з абдымкаў патрыярхату».

Стужка гаворыць пра экзістэнцыйныя крызісы, пра спробы ўцёкаў ад безнадзейнай пустэчы. Толькі няма куды ўцякаць, калі пустэча ў сэрцы, а грамадства само спараджае і сілкуецца безнадзейнасцю.

Але фільм Сэма Мэндэза, як і шэдэўры Тэнэсі Уільямса, — пра небяспеку мараў, якія вядуць да смерці. Пра любоў і неабходнасць паразумення.

Пра мужнасць і мудры гераізм, якія патрабуюцца, але якіх бракуе, каб жыць у звычайнай штодзённасці.

**Андрэй Расінскі**

**Альбом Артура Клінава**

4 лютага (серада) а 18.00 у бібліятэцы імя Пушкіна (Гікала, 4, Мінск), пройдзе прэзентацыя новага праекту альманаху *pARTisan* — серыі мастацкіх альбомаў «Калекцыя пАРТызана». Першым у серыі выйшаў альбом «Дванаццаць» канцэптуальнага мастака Артура Клінава. Таксама адбудзецца прэзентацыя восьмага нумару альманаху. Бяруць удзел Артур Клінаў (галоўны рэдактар часопісу), Максім Жбанкоў (рэдактар нумару), філёзафы Валянцін Акудовіч і Алесь Анціпенка, «дэструктыўны пажарны аркестр» Андрэя Такінданга «Гаротніца».
Даведкі: partisan.art@gmail.com, (29) 673-35-02 (Дар'я)




**Прэзентацыя кнігі пра Алеся Разанава**

**11 лютага Гістарычная майстэрня (Сухая, 25)** запрашае на прэзентацыю кнігі Анатоля Івашчанкі «Паэтыка Алеся Разанава: між медытацыяй і рацыяй». У імпрэзе бяруць удзел: Уладзімір Арлоў, Ігар Бабкоў, Галіна Дубянецкая, Барыс Пятровіч, Усевалад Сцебурака, Пятро Васючэнка, Ганна Кісліцына, Алесь Пашкевіч, Анатоль Сідарэвіч, Міхась Тычына, Алесь Разанаў, гурт старажытнай музыкі «Расалія». Імпрэза ладзіцца ў межах агульнабеларускай кампаніі «Будзьма!» **Пачатак а 17-й.** Уваход вольны.

# «Белсат»: тэлепраграма на 9—15 лютага
# «Белсат» — гэта незалежны беларускі спадарожнікавы тэлеканал

### 9 лютага, панядзелак

**18.00** Аб'ектыў (навіны)
**18.10** «Ранча», серыял, 12 серыя
**19.00** «Цэнтральная Азія — з занядбанага краю на Радзіму», дак. фільм, 2007 г., Японія
**19.55** «Права быць свабодным» — канцэрт альтэрнатыўнай музыкі (Луцк, 2007), ч. 3. Выступ гуртоў «Зніч» і «Тав. Маўзер»
**20.25** Тыдзень з радыё «Свабода»
**21.00** Аб'ектыў (навіны)
**21.20** Хто ёсць кім? Журналістка Ірына Халіп — мужнае сэрца
*Вострыя публікацыі гераіні фільму, журналісткі Ірыны Халіп, неаднаразова станавіліся косткаю ў горле ўладаў. На яе нават заводзілі крымінальную справу. Але дзякуючы сваёй мужнасці, прафесійнасці і таленту Ірына набыла ў змаганні толькі вядомасць. Яе ўшанавалі прэміяй «Герой Еўропы» ў намінацыі «Мужнае сэрца», заснаванай амерыканскім часопісам Time.*




**21.40** «Энтані Цымер», дэтэктыўная меладрама, рэж. Жэром Саль, 2005 г., Францыя.
**23.10** «Элі Макбіл», тэлесерыял: III сезон, 13 серыя
**00.00** Аб'ектыў (навіны)

### 10 лютага, аўторак

**18.00** Аб'ектыў (навіны)
**18.10** «Элі Макбіл», тэлесерыял: III сезон, 13 серыя
**18.55** «Права быць свабодным» — канцэрт альтэрнатыўнай музыкі (Луцк, 2007), ч. 4. выступ гуртоў «Уліс» і «Крама».
**19.20** «Жаночы раман», маст. фільм, рэж. Філіп Рэнч, 2005 г., Чэхія.
**21.00** Аб'ектыў (навіны)
**21.15** «Музычныя партызаны», дак. фільм, 2007 г., Польшча
**22.15** Рэпарцёр (публіцыстычная праграма)
**22.45** Еўропа сёння: тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»
**23.15** «Элі Макбіл», тэлесерыял: III сезон, 14 серыя
**00.00** Аб'ектыў (навіны)

### 11 лютага, серада

**18.00** Аб'ектыў (навіны)
**18.10** «Элі Макбіл», тэлесерыял: III сезон, 14 серыя
**18.55** Паштоўка з Вільні (праграма пра беларусаў у Літве)
**19.10** «Звычайны прэзідэнт», дак. фільм, рэж. Юрый Хашчавацкі, 1997 г., Беларусь
**20.05** Маю права (праавая праграма)
**20.25** Праект «Будучыня»: навукова-папулярны агляд тэлеканалу «Нямецкая хваля»
**21.00** Аб'ектыў (навіны)
**21.15** YoLife! (моладзевая праграма)
**21.35** «Невядомая Беларусь»: «Слуцкі збройны чын», дак. фільм, 2008 г.
**22.10** Госць «Белсату»: перадача пра надзённыя праблемы Беларусі
**22.25** «Права быць свабодным» — канцэрт альтэрнатыўнай музыкі (Луцк, 2007), ч. 4. Выступ гуртоў «Уліс» і «Крама».
**23.00** «Зграя», дэтэктыўны серыял, 6 серыя
**00.00** Аб'ектыў (навіны)

### 12 лютага, чацвер

**18.00** Аб'ектыў (навіны)
**18.10** «Зграя», дэтэктыўны серыял, 6 серыя
**19.05** Падзямка (беларускі хіт-парад)
**19.40** «Без рэтушы»: «Людзі старой веры», дак. фільм, 2008 г.
**20.05** «Бацькі ў сваты», дак. фільм, 2007 г., Японія
*Кожную суботу ў парку ля плошчы Нябеснага Спакою ў Пекіне збіраецца натоўп. Гэта бацькі дзяцей, якія нарадзіліся ў выніку палітыкі «аднаго дзіцяці». Яны прыходзяць сюды, каб знайсці свайму дзіцяці пару. Палітыка «аднаго дзіцяці» ў Кітаі праводзіцца з 1979 г., і прадстаўнікам першага пакалення гэтай палітыкі ўжо амаль 30 гадоў. Шмат хто з іх, нягледзячы на старанні бацькоў, не мае жадання выходзіць замуж або жаніцца: ім больш даспадобы камфортнае жыццё пад апекаю бацькоў. Тады бацькі бяруць справу ў свае рукі. І што цікава, дзецям гэта падабаецца. Моцная эмацыйная повязь паміж бацькамі і дзецьмі замінае апошнім пачаць дарослае жыццё, стварыць новую сям'ю.*
**21.00** Аб'ектыў (навіны)
**21.15** Сальда (эканамічная праграма)
**21.35** На колах: аўтамабільны агляд тэлеканалу «Нямецкая хваля»
**22.10** Інтэрнаўты выбіраюць
**22.50** «Зграя», дэтэктыўны серыял, 7 серыя
**23.45** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы



**00.00** Аб'ектыў (навіны)

### 13 лютага, пятніца

**18.00** Аб'ектыў (навіны)
**18.10** «Зграя», дэтэктыўны серыял, 7 серыя
**19.05** Праект «Будучыня»: навукова-папулярны агляд тэлеканалу «Нямецкая хваля»
**19.40** «Ісабэль Альендэ», дак. фільм, 2007 г.
**20.40** Беларусы ў Польшчы
**21.00** Аб'ектыў (навіны)
**21.15** Госць «Белсату»: Алег Трусаў
*Алега Трусава найбольш згадваюць як палітыка — дэпутата Вярхоўнага Савету XII склікання. Ён браў удзел у абвяшчэнні сувэрэнітэту Рэспублікі Беларусь, быў адным з распрацоўнікаў выявы беларускага дзяржаўнага герба. Удзельнічаў у галадоўцы дэпутатаў апазіцыі БНФ 11—12 красавіка 1995 г., пратэстуючы супраць арганізаванага Лукашэнкам рэферэндуму. Але ж Алег Трусаў набыў вядомасць не толькі як палітык. Яшчэ ў савецкія часы ён належаў да нешматлікага кола гісторыкаў, для якіх гісторыя Беларусі была самастойным аб'ектам даследавання. Абараніў кандыдацкую дысертацыю па археалогіі, нейкі час быў дэканам факультэту бібліятэчна-інфармацыйных сістэмаў Беларускага універсітэту культуры, уваходзіў у лік заснавальнікаў вядомага Беларускага гуманітарнага ліцэю, дзе выкладае і цяпер. А з 1999 г. сп. Трусаў — старшыня Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны.*
**21.35** «Дзеці і рыбы», маст. фільм, рэж. Яцэк Бромскі, 1997 г., Польшча
**23.10** «Пітбуль», серыял, 13 серыя
**00.00** Аб'ектыў (навіны)

### 14 лютага, субота

**18.00** Аб'ектыў (навіны)
**18.10** Тыдзень з радыё «Свабода»
**18.45** «Girls Rock!», дак. фільм, рэж. Арн Джонсан і Шэйн Кінг, 2007 г., ЗША
*У Rock'n'Roll Camp дзяўчаты ва ўзросце ад 8 да 18 гадоў вучацца граць на гітарах, бубнах і крычаць. Яны самі пішуць тэксты песняў і маюць тыдзень на тое, каб стварыць гурт, а напрыканцы мусяць выступіць перад публікаю. Гэтая справа мае дапамагчы дзяўчатам спазнаць саміх сябе, адчуць свабоду і энергію, што нясе ў сабе rock'n'roll.*
**20.20** Кружэлка (сусветная музыка)




**21.00** Аб'ектыў (навіны)
**21.15** YoLife!
**21.30** Еўропа сёння: тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»
**22.00** «Разбітая шклянка», маст. фільм, рэж. Білі Рэй, 2003 г., ЗША.
*У аснове фільму — сапраўдная гісторыя вашынгтонскага журналіста Стывена Глэса, які за тры гады працы — у свае дваццаць! — дасягнуў як прафесіянал незвычайных вышыняў і стаў асноўным аўтарам уплывовага часопісу. Ягоныя артыкулы, прасякнутыя гумарам, пікантнымі дэталямі і плёткамі, разрываюць чытацкую аўдыторыю як сапраўдныя бомбы. Дарма, што ўсё гэта — толькі выдумкі... Глэс працягвае пісаць свае неверагодныя гісторыі, пакуль аднойчы канкурэнты не выкрываюць яго...*
**23.40** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (гумарыстычная праграма)
**00.00** Аб'ектыў (навіны)

### 15 лютага, нядзеля

**18.00** Прэс-экспрэс (агляд друку)
**18.15** «Ранча», серыял, 13 серыя
**19.05** «Наша сцэна»: канцэрт Змітра Вайцюшкевіча
**19.45** Жаўтуха (гумарыстычная праграма)
**20.10** «Расія, Чачня. Галасы іншадумцаў», дак. фільм, рэж. Карла Нэра, 2005 г., Вялікабрытанія
*Стужка сведчыць, якім жахлівым чынам прадстаўнікі ФСБ праз выбухі ў жылых дамах і вайну ў Чачні прыйшлі да ўлады ў Расіі, як яны выціскаюць апазіцыю ды іншадумцаў з эфіру і з палітыкі, як у выніку здзейсненага імі «чачэнскага эксперыменту» павялічылася тэрарыстычная пагроза.*
**21.00** Аб'ектыў (вынікі тыдня)
**21.20** Ток-шоу «Форум»: Каб людзьмі звацца.
*Пра беларукую цярплівасць і пакорлівасць складаюць показкі: абы не было вайны... Бацька лепш за нас ведае, што трэба ягонаму народу. Абыякавасць нашага сучасніка да свайго жыцця бачная ў нежаданні браць на сябе адказнасць не толькі за лёс сваёй краіны, але нават і за свой уласны. Чаму большасць беларусаў не чуюцца гаспадарамі свайго лёсу?*




**22.20** «За жменю даляраў», маст. фільм, рэж. Серджыа Леонэ, 1964 г., Італія.
*Гэты вестэрн зрабіў зоркаю Клінта Іствуда і спрыяў поспеху Леонэ ды кампазітара Эніё Марыконэ. У мястэчка, дзе адбываецца сапраўдная вайна паміж двума сямейнымі кланамі, якім начхаць на закон, з'яўляецца самотны падарожнік, якому таксама начхаць на закон. Ягоная моц — ва ўменні страляць хутка і дакладна. Але яшчэ ён імкнецца абараніць слабых і безабаронных.*
**23.45** «Бульбаны», мульт. серыял
**00.10** Аб'ектыў (навіны)





ЛЕВЫМ ВОКАМ



# Трагедыя фізкультурніка

**У сетку праграм дзяржаўнага радыё вяртаецца ранішняя праграма «Вытворчая гімнастыка», вядоўцы якой будуць штодня вучыць нас розным фізічным практыкаванням. Фельетон Лёліка Ушкіна.**

Кабінет доктара

**Пацыент:** Можна?

**Доктар:** Калі ласка. Што ў Вас?

**Пацыент:** У мяне вялікая праблема — я абсалютны гаспадар усіх беларусаў.

**Доктар:** Вы лічыце сябе Аляксандрам Лукашэнкам? Цікавы выпадак. Быў у нас нейк хворы, які лічыў сябе праспектам Машэрава. Уяўляеце яго псіхічны стан пасля таго як праспект назвалі праспектам Пераможцаў! Давялося яго заасфальтаваць па новай, каб супакоіўся... І калі гэта ў Вас пачалося?

**Пацыент:** Вы не зразумелі — я мацнейшы за Лукашэнку. Ён ніхто ў параўнанні са мною.

**Доктар:** Так-так, усё значна горш, чым я меркаваў... І хто ж Вы — Пазняк, Рэмба, Абама або стары Хатабыч?

**Пацыент:** Я — вядоўца праграмы «Вытворчая гімнастыка», якую шторанку перадаюць па радыё.

**Доктар:** А! Я і чую, голас у вас знаёмы! Я, праўда, яе слухаю, так, краем вуха, спрасоння...

**Пацыент:** У тым і рэч, доктар. Мала хто слухае, аднак мае інструкцыі адкладваюцца ў свядомасці людзей. У выніку беларусы паступова пачынаюць падпарадкоўвацца мне. Неяк я заўважыў, як пасярод вуліцы людзі раптам займаюць позу: рукі на шырыні плеч, роўна дыхаюць, трымаюць хрыбет, робяць нейкія пасы рукамі. Часам некаторыя проста бухаліся ў снег, дзе ў позе «лежачы на спіне» качалі прэс. Спачатку я думаў, што гэта псіхі. Аднак пачынаю разумець, што яны выконваюць мае загады!

**Доктар:** Божухна!

**Пацыент:** Каб праверыць сваю версію, я наўмысна сказаў нейкую бязглуздзіцу: «А цяпер пераходзім да заняткаў для біцэпсаў. Сядзьце ў позу лотаса і дэвальвуйце нацыянальную валюту на 20%». Што было пасля — Вы ведаеце...

**Доктар:** Слухайце, Ваш выпадак проста фантастычны!

**Пацыент:** Доктар, я патрабую неадкладнага накіравання ў Навінкі. Я звычайны чалавек, які можа неадэкватна эмацыйна рэагаваць на бытавыя рэчы. Уявіце, калі заўтра зноў будзе дэвальвацыя. Я ж магу заклікаць штурмаваць Нацбанк! А што, калі раптам буду сексуальна заклапочаны: запатрабую, каб усе беларускі хадзілі ў празрыстых стрынгах? Прычым зімою. Жах!

**Доктар:** Пачакайце, дарагі. Давайце так: я кладу Вас у лякарню паслязаўтра, а заўтра раніцай у сваёй праграме Вы зробіце агаворку, накшталт: «А цяпер прысядаем і ўздымаем бюджэтны артыкул на фінансаванне медыцыны». Дамовіліся?

**Пацыент** (сыходзячы): Як раз плюнуць! Да паслязаўтра!

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

**Тэлеграф на паперы.** Рэвізія маскоўскай паштова-тэлеграфнай акругі знайшла, што на будову адной тэлеграфнай лініі грошы даўно ўзятыя, а як пачалі шукаць гэту лінію на месцы, дзе яна мелася быць, дык яе і не аказалася!

**«Наша Ніва». № 5. 1909**

## ЖАРТЫ

Міліцыянер спыняе студэнта і загадвае паказаць дакументы.

— Та-ак, не працуем, значыць...

— Так, не працуем.

— Та-ак, грошыкі дзяржаўныя праядаем, значыць...

— Так, праядаем.

— Та-ак, студэнты мы, значыць...

— Не, прабачце, студэнт толькі я!

* * *

— Як вам з такімі манерамі і такой дыкцыяй удалося зрабіцца тэлевядучым?! Блат, напэўна?

— Які блат! Сястла!



**Ой, што я знаю, Уладзімір Уладзіміравіч... Прэм'ер Беларусі Сяргей Сідорскі на перамовах з Уладзімірам Пуціным у Маскве. Па выніках перамовах Пуцін абвесціў аб датэрміновай выдачы Беларусі другой траншы крэдыту памерам 1 млрд даляраў.**



**Помнік чаравіку ўсталявалі на радзіме Садама Хусэйна ў акупаваным амерыканскімі войскамі Іраку. Такім чынам земляі ірацкага дыктатара адзначылі ўчынак журналіста Мунтазера аль-Зэйдзі, які падчас прэс-канферэнцыі ў Багдадзе кінуў у прэзідэнта ЗША Джорджа Буша сваімі чаравікамі.**


## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

КНІГІ

**Кніжка «Максім Багдановіч. Інтымны дзённік. Выбраныя творы»** — выкшталцоны падарунак на Дзень Святога Валянціна! Т.: 262-65-29. Алег

**Прапаную кнігу для малодшых школьнікаў** «Навошта чалавеку галава». Кошт 1 асобніка 3000 рублёў. Т.: 286-41-69. Генадзь Шэршань

**Прыватныя абвесткі ў «НН»** (не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e-mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!



Наша Ніва

незалежная газета

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
заснавальнік — Мясцовы фонд выдання газеты «Наша Ніва»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**



© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.



12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Кошт свабодны. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №581 ад 14 сакавіка 2007 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, пр. Ракасоўскага, 102-71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

Наклад 5700. Газета выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 03.02.2009.
Замова № 605.
Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102-71.

ISSN 1819-1614

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

9771819161008 09005